Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 СТУДЗЕНЯ 2024 г. СУБОТА № 14 (30148)

НАША НОВАЯ ВАЕННАЯ ДАКТРЫНА 4

МЕСЯЦАВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2024 ГОД 8-9

У БЕЛАРУСІ ЗАСНАВАНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗНАК ЯКАСЦІ

Адпаведны Указ № 21 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Дакументам зацверджана выява і апісанне знака. Ён уяўляе сабой пяцівугольнік чырвонага колеру, у цэнтры якога размешчана стылізаваная выява перавернутай літары «К» і надпіс «Беларусь». Пяць вуглоў знака сімвалізуюць якасць беларускай прадукцыі, якая дасягаецца спалучэннем пяці паказчыкаў вытворчасці: бяспекі, экалагічнасці, інавацыйнасці, тэхналагічнасці і эстэтычнасці.

Парадак прысвоення Дзяржаўнага знака якасці і пералік стымуляцыйных ільгот і прэферэнцый, якія выдзяляюцца вытворцам пры яго прысваенні, будзе вызначаны ўрадам.

Заснаванне Дзяржаўнага знака якасці мае на мэце садзейнічаць павышэнню якасці беларускіх тавараў і паслуг.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У БЕЛАРУСКІМ АЎТАМАБІЛІ ПАВІННА БЫЦЬ ЯК МАГА БОЛЬШ БЕЛАРУСКАГА»

Фота БелТА.

Акцэнты на лакалізацыю і мадэрнізацыю вытворчасці, а мэты — на перспектыву для краіны

У час урачыстага адкрыцця завода «БЕЛДЖЫ» ў лістападзе 2017 года Прэзідэнт заявіў, што яго мара — атрымаць у Беларусі ўласны легкавы аўтамабіль — ажыццявілася. На пачатку 2024 года кіраўнік дзяржавы асабіста азнаёміўся з тым, як рэалізоўваецца і развіваецца гэты праект. Чарговая рабочая паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Барысаўскі раён была прысвечана развіццю аўтамабілебудавання і электратранспарту.

У снежні 2023 года «БЕЛДЖЫ» споўнілася 12 гадоў. Гісторыя завода пачыналася з невялікай вытворчасці, дзе працавала крыху больш за 50 чалавек. Цяпер гэта вядомае на ўсю краіну прадпрыемства, тут працуюць каля паўтары тысячы чалавек. «Мы краіна аўтамабілістаў. Мы ствараем такія машыны, што любая краіна можа пазайздросціць: і малатанажныя, і сярэднетанажныя, і буйнатанажныя — БелАЗ. МАЗ — сярэдняга класа аўтамабіль па грузападымальнасці», — адзначаў Аляксандр Лукашэнка ў кастрычніку падчас сустрэчы з маладзёжным актывам краіны. Самы малады член «аўтамабільнай беларускай сям'і» — легкавы аўтамабіль пачаў сваю гісторыю менавіта на заводзе «БЕЛДЖЫ».

Па прылёце на завод першае, што ўбачыў кіраўнік дзяржавы, — вялікая паркоўка з гатовымі аўтамабілямі. «У нас такія чэргі на аўтамабілі, а ў цябе склад забіты», — адразу ж заўвага кіраўніку прадпрыемства. Той тлумачыць: аўтамабілі на паркоўцы — гэта трохдзённы аб'ём вытворчасці. Прадукцыя пастаўляецца пакупнікам як у Беларусі, так і ў Расіі. У дылераў у Беларусі цяпер знаходзіцца каля 800 аўтамабіляў.

КАБ ЛЯЦЕЦЬ НА ДВУХ КРЫЛАХ

Міністр прамысловасці Аляксандр Рагожнік далажыў Прэзідэнту аб развіцці аўтамабілебудавання і электратранспарту. Па яго словах, галіна забяспечыла выкананне асноўных мэтавых паказчыкаў. У 2023 годзе быў дасягнуты максімальны за 20 гадоў аб'ём экспарту. Рэалізоўваецца маштабная інвестыцыйная праграма, у тым ліку з удзелам расійскага боку. Сёння суседняя краіна вельмі зацікаўлена ў прадукцыі беларускага аўтапрама і гатова фінансаваць адпаведныя праекты. Тым больш што ў Беларусі ёсць і вытворчыя магутнасці, і кампетэнтныя супрацоўнікі.

«Трэба гэтым скарыстацца. Рынак ёсць, мы запатрабаваныя. Яны хочуць з намі мець справу. У нас ёсць кампетэнцыі, мы іх захавалі. Трэба гэтым скарыстацца, тым больш грошы даюць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Трэнд сучаснага машынабудавання — электратранспарт. У Жодзіне і Шклове рэалізоўваюцца пілотныя праекты па пераводзе пасажырскага транспарту на электрацягу. За гэты год два гарады пяройдуць на «электрычкі» поўнасцю. «Гэта правільна. Трэба на месцах людзям паказваць, што гэта перспектыва і ў гэтым напрамку трэба працаваць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён заўважыў, што ў кантэксце гэтых праектаў трэба звярнуць увагу на стан дарог, на абсталяванне прыпыначных пунктаў. І на гэта пытанне павінны звярнуць увагу і губернатары.

СТАР. 2-3

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«20 гадоў таму Прэзідэнт прыняў рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, таму што разумеў і прадбачыў, што толькі тыя краіны, якія ўмеюць вырабляць сучасную ваенную тэхніку, могуць забяспечыць сваю абароназдольнасць. І сёння мы бачым, як запатрабавана гэта прадукцыя, які на яе попыт у свеце. Дзяржкамваенпрам за гэтыя гады прарабіў значную работу па развіцці галіны, укладзены вялікія сродкі ў мадэрнізацыю і стварэнне новых вытворчасцяў. Сёння можна гаварыць аб тым, што тыя задачы, якія былі пастаўлены перад Дзяржкамваенпрамам на гэты перыяд, дасягнуты».

Духоўнае і зямное

«Нам бы заслужыць міласці Божай»

Ігумення талачынскага Свята-Пакроўскага жаночага манастыра матушка Анфіса (Любчак) — пра прадвызначанасць лёсу, нябесных ахоўнікаў манастыра і духоўнае выхаванне моладзі.

Сёлета матушка Анфіса стала лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне». Так высока ацанілі яе дзейнасць па адраджэнні талачынскай жамчужыны праваслаўя — Свята-Пакроўскага манастыра, — дабрачыннасць і клопат пра сацыяльна ўразлівыя катэгорыі насельніцтва. Сёння матушка расказвае пра сваё падзвіжніцкае жыццё чытачам «Звязды».

СТАР. 13

Талачынская жамчужына.

ISSN 1990 — 763X

«У БЕЛАРУСКІМ АЎТАМАБІЛІ ПАВІННА БЫЦЬ ЯК МАГА БОЛЬШ БЕЛАРУСКАГА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністр прамысловасці расказаў, што вытворцы электратранспарту закантрактаваны на бягучы год і цяпер заключаюць кантракты на 2025-ы, прадукцыя вельмі запатрабавана. «Значыць, і я не памыліўся, калі было прынята рашэнне аб будаўніцтве завода па вытворчасці аўтобусаў. Трэба толькі хуткчэй, пакуль попыт ёсць, пабудаваць», — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка даў сваю адзнаку айчыннаму аўтамабілебудаванню: «Мы — птушка, якая ляціць не на адным крыле, а на паўтара крыла». Грузавікі, самазвалы і іншае — класна мы робім. У гэтай лінейцы не хапае аднаго — легкавога аўтамабіля, які мы пачалі рабіць. У гэтай лінейцы павінен быць легкавы аўтамабіль. Гэта для людзей. Нам трэба дайсці да кожнага чалавека. Чарга шалёная. Людзі хочуць купляць гэты аўтамабіль. Ураду галоўная задача і міністра — кроў з носа задаволіць попыт. Пажадана, каб мы задавальнялі гэты попыт. У адваротным выпадку — свята месца пустое не бывае, прыйдуць канкурэнты. Таму трэба, наколькі гэта магчыма, павялічваць вытворчасць легкавога транспарту».

Новы кірунак развіцця айчыннага легкавога машынабудавання — вытворчасць у СП ЗАТ «ЮНІСАН» легкавых аўтамабіляў маркі «HONGQI» (Хунцы) вытворчасці кітайскай кампаніі FAW. У перспектыве дасягнутыя дамоўленасці дадуць магчымасць ажыццяўляць не толькі буйнавузлавую, але і дробнавузлавую зборку легкавых аўтамабіляў з наступнай лакалізацыяй асобных вузлоў і камплектуючых. Кіраўнік дзяржавы адзначыў важнасць супрацоўніцтва з кітайскімі партнёрамі, у якіх ёсць і магутнасці, і кампетэнцыі. Ён падкрэсліў, што ў кітайскіх партнёраў неабходна вучыцца і пераймаць досвед. Але, па яго словах, не варта распыляцца. Трэба вызначацца і дзейнічаць.

Застаецца адно пытанне — лакалізацыя. «Нам трэба вырабляць больш», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Таксама адна з задач Прэзідэнта — мадэрнізацыя. У 2023 годзе «БЕЛДЖЫ» атрымана ліцэнзія на вытворчасць мадэлі X50. Арганізавана работа па імпартазамяшчэнні шэрагу аўтакампанентаў і матэрыялаў на айчынныя. У 2024 годзе запланавана атрыманне ліцэнзіі на яшчэ дзве мадэлі — X70, S50. Яны дазволяць актывізаваць работы па імпартазамяшчэнні аўтакампанентаў і ў выніку стварыць кампетэнцыі не толькі па вытворчасці легкавых аўтамабіляў, але і іх распрацоўцы і мадэрнізацыі. Таксама ўзгадняецца план мадэрнізацыі завода для павелічэння магутнасці да 120 тысяч аўтамабіляў у год пры двухзменным рэжыме працы.

У мінулым годзе завод перадаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўзор X50, на базе чаго будзе створаны айчынны электрамабіль. Пасля правядзення канструктарскіх работ серыйную вытворчасць айчыннага электрамабіля плануецца на СЗАТ «БЕЛДЖЫ». Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што часу на разварушванне няма і трэба актыўна працаваць, пакуль у свеце трэнд на такія машыны і попыт расце. Ён спытаў, колькі часу патрэбна, каб ажыццявіць гэты праект. Спецыялісты спрагназавалі паўтара года. Але кіраўнік дзяржавы гэты тэрмін зменшыў. «Ваша задача — да 1 студзеня 2025 года вы павінны ў асноўным усё гэта зрабіць», — даручыў Аляксандр Лукашэнка. Зразумела, што і пры ажыццяўленні гэтага праекта нельга забываць пра лакалізацыю і імпартазамяшчэнне. З некаторымі ўзорамі айчынных камплектуючых і дэталяў кіраўнік дзяржавы азнаёміўся асабіста. Прэзідэнт заклікаў адказных спецыялістаў не спыняцца на дасягнутым, каб пакінуць дзецям «добрыя задзелы».

«ДАВАЙЦЕ БУДУЧЫНЯЙ ЗАЙМАЦЦА ЦЯПЕР»

Аляксандр Лукашэнка асабіста азнаёміўся з вытворчасцю народных аўтамабіляў. Ён наведаў зварачны цэх і цэх па зборцы. У вытворчасці выкарыстоўваецца сістэма 5S, што асабліва актуальна ў Год якасці. Галоўныя элементы сістэмы: стандартызацыя, утрыманне ў чысціні, удасканаленне, выкананне парадку, сарціроўка. Гэта эфектыўная кітайская сістэма арганізацыі і рацыналізацыі рабочай прасторы. Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся працэсам стварэння аўтамабіляў і работай прадпрыемства.

Таксама Прэзідэнт пазнаёміўся з апошнімі здабыткамі айчыннага аўтапрама. Цэнтральныя экспанаты адпаведнай выстаўкі — мадэлі электратранспарту. Сярод іх першы доследны ўзор седлавога цягача MAZ-X. Гэта гібрыдныя машына, якая мае дызельны рухавік і электрарухавік. Кіраўніку дзяржавы прадставілі еўразійскі электробус мадэлі E321. Ён амаль поўнасцю адпавядае патрабаванням Прэзідэнта — лакалізацыя амаль 80 працэнтаў, электроніка ўся беларуская. Быў прадстаўлены 130-тонны БЕЛАЗ-7513М2, які працуе на вадародзе. Гэта эканамічна і экалагічна. Сярод навінак — 90-тонны электрасамазвал БЕЛАЗ-7558Е на літый-іонных акумулятарных батарэях.

На выстаўцы былі прадстаўлены і ўзоры новага кірунку ў айчынным машынабудаванні — аўтамабілі маркі HONGQI («Хунцы») вытворчасці кітайскай кампаніі FAW. Аляксандр Лукашэнка назваў гэтыя машыны прыстойнымі.

Зразумела, не абышлося без доследнага ўзору электрамабіля Belgee E-X50. Прэзідэнт дэталёва азнаёміўся з яго характарыстыкамі і заўважыў, што ведае «ўсе касякі». «У вас год часу, каб мы пачалі вытворчасць такіх аўтамабіляў. Калі электрамабіль — гэта будучыня, дык давайце гэтай будучыняй займацца цяпер», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да віцэ-прэм'ера Пятра Пархомчыка.

ПРАДПРЫЕМСТВА АДБЫЛОСЯ. АЛЕ ТРЭБА ЯШЧЭ ПРАЙСЦІ ВЯЛІКІ ШЛЯХ

Па традыцыі, наведваючы прадпрыемствы, кіраўнік дзяржавы сустракаецца з працоўным калектывам. «БЕЛДЖЫ» выключэннем не стаў. Аляксандр Лукашэнка назваў радасцю і шчасцем тое, што на заводзе працуюць маладыя людзі. «Прадпрыемства адбылося. Не будзем сябе перахвальваць і захвальваць. Вялікі шлях нам яшчэ трэба прайсці, каб не цягаць камплектуючыя з усяго свету, найперш з дружалюбнага нам Кітая. Дзякуй ім, што дапамаглі стварыць такое прадпрыемства. Цяпер мы ўжо саспелі, каб рабіць аўтамабіль па максімуме беларускім», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў перспектыве тут будзе пабудаваны кузаўны цэх. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што, мабыць, няма ў свеце ніводнай кампаніі, якая выбрала б камплектуючыя ў адной краіне, ці то самалёт, ці то аўтамабіль. Вялікая кааперацыя развіваецца ва ўсім свеце. «У сувязі з тым, што свет ашалеў, канкурэнцыя даходзіць да ваенных дзеянняў, нам трэба разлічваць найперш на дружалюбныя краіны, якія нас не падставяць, — абазначыў прыярытэты Прэзідэнт. — Гэта я да чаго: калі мы будзем купляць рухавік, мы

Фота БелТА.

павінны цвёрда разумець на перспектыву, што Кітай ці Расія будуць пастаўляць, вырабляць гэтыя рухавікі вечна, каб не кінулі нас так, як гэта зрабілі заходнія дзяржавы».

Прэзідэнт патлумачыў, навошта ён прыехаў на прадпрыемства. «Што далей?» — задаў ён рытарычнае пытанне ўсім прысутным. Прэзідэнт падкрэсліў, што беларусы ўмеюць рабіць аўтамабілі, кар'ерныя самазвалы, выдатныя грузавікі, пасажырскую тэхніку, і на ўсё ёсць попыт. Застаўся адзін сегмент — легкавы транспарт, які ўжо пачалі рабіць. «Назад нельга, стаяць нельга. Толькі наперад. Як будзем рухацца далей?» — спытаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прызнаўся, што ў яго была мара пабудаваць свой аўтамабіль. Яна спраўдзілася пры падтрымцы сяброў. Без яе беларусам было б вельмі цяжка стварыць такі аўтамабіль, за якім стаялі б чэргі, як сёння. Бо свет у будаўніцтве аўтамабіляў сышоў далёка. Ён заўважыў, што сёння ўвесь свет заточаны на вытворчасць гібрыдных аўтамабіляў і на чыстыя электрамабілі. «Свет нам дэманструе, куды рухацца, і мы вызначылі, што мы гэтым шляхам павінны ісці. Але мадэрнізуючы і ўдасканальваючы гэту вытворчасць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Канешне, мы будзем садзейнічаць таму, каб развіваць і мадэрнізаваць гэта прадпрыемства». Ён звярнуў увагу, што перавага нашай сістэмы ў тым, што ўсе прадпрыемствы дзяржаўныя. І калі нехта не туды глядзіць, яго накіроўваюць, куды трэба, каб глядзець на канчатковы вынік. «Будзем павялічваць долю беларускага ў гэтым аўтамабілі настолькі, наколькі мы гэта можам зрабіць і наколькі гэта абыдзецца, каб на рынку быць канкурэнтаздольным, каб на рынку прадаць можна было. Таму гэта галоўная мэта, куды будзем рухацца са сваім легкавым аўтамабілем», — заявіў беларускі лідар. Найперш — максімальная лакалізацыя, наколькі гэта магчыма. Калі нешта не атрымаецца вырабіць у сябе — прыйдзецца купляць. Для лакалізацыі вытворчасці легкавых аўтамабіляў будуць задзейнічаны і іншыя беларускія прадпрыемствы. Напрыклад, электрарухавікі для беларускіх электрамабіляў будуць вырабляць у Магілёве.

«Мэта майго прыезду — перспектыва. Пакуль я Прэзідэнт, мы гэты завод не кінем. Гэта маё дзіця. Мы з вамі яго нарадзілі. Будзем яго ўдасканальваць, гадаваць, навучаць і гэтак далей. Я не думаю, што і іншы чалавек на маім месцы ад гэтага адмовіцца. Навошта? Гэта настрой людзей. Гэта здабытак нашага беларускага чалавека. Мы гэта зрабілі і будзем рухацца наперад», — заявіў Прэзідэнт. Ён падзякаваў калектыву «БЕЛДЖЫ» за тое, што на дадзеным этапе яны зрабілі ўсё, каб людзі сталі ў чаргу па аўтамабілі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што цяпер працуе 14 сэрвісных і 33 дылерскія цэнтры. Па яго словах, трэба 50 — будзе 50. «Мы вас будзем усяляк падтрымліваць. Працуйце сумленна, дысцыплінавана. Ведайце, што ні вас, ні вашых дзяцей нідзе ніхто не чакае. Кажу вам шчыра. Зрабіце так, каб вашыя дзеці імкнуліся на гэту вытворчасць, каб яны тут раслі, станавіліся інжынерамі, галоўнымі інжынерамі, кіраўнікамі — нам гэта вельмі патрэбна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што калектыў гэтага прадпрыемства пастаянна знаходзіцца ў полі зроку Прэзідэнта.

Пытанні да кіраўніка дзяржавы былі самыя розныя — ад прыватных да сацыяльных і палітычных тэм. Спецыяліст цэха зборкі Алена Грыдзіна пацікавілася магчымасцю працягнення праграмы крэдытавання айчынных аўтамабіляў. У гэтым годзе праграма працягнута. «Я прыхільнік таго, каб паціху яе згортваць. Тыя, хто купляе, бяруць нечыя грошы. У выніку гэта звозіцца да бюджэту. А ў нас што, бюджэтныя грошы няма куды траціць?» — адказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што праграма была прынята, каб раскруціць прадпрыемства і стымуляваць попыт. «Будзем глядзець, як вы будзеце працаваць, будзем лічыць грошы. Калі сітуацыя будзе больш-менш цярпімай, мы будзем гэтай праграмы прытрымлівацца. Але гэта ў дадзенай сітуацыі ў адносінах да нашага насельніцтва, калі чарга стаіць па аўтамабілі — гэта няправільна», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мэты, якія ставіла перад сабой гэта праграма, дасягнуты, таму трэба гэтыя механізмы адмяняць. Але ў найбліжэйшых планах гэтага няма. «Пакуль наша эканоміка трывае», — канстатаваў ён.

МІР ВЕЛЬМІ ДОРАГА КАШТУЕ. І ЗА ЯГО ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

Слесар на працы і шматдзетны бацька дома Дзмітрый Паўловіч пацікавіўся ў Аляксандра Лукашэнкі, як абмежаваць дзяцей ад шкоднага ўплыву інтэрнэту. Прэзідэнт прызнаўся, што і для яго актуальнае гэта пытанне, паколькі яго малодшы сын таксама шмат часу праводзіць у інтэрнэце. «Малодшы ўвесь час там. Але карысці ад яго шмат. Ён мне прыносіць усю інфармацыю: «Тата, паглядзі, народ піша», — адзначыў ён. Але сваім рэцэптам кіраўнік дзяржавы падзяліўся: трэба, каб дзіця было занятае такім чынам, каб вольнага часу на інтэрнэт у яго не заставалася. І пры гэтым вельмі важны прыклад бацькоў. «Ты сам павінен паказаць свайму дзіцяці, якім яно павінна быць», — сказаў ён. І яшчэ адна парада ад Прэзідэнта: занадта не песціць дзяцей, а прыцягваць іх да працы. У маладых людзей ёсць рэзервы арганізма, якія яны могуць эфектыўна задзейнічаць і накіроўваць на спорт, вучобу, у карыснае рэчышча, і тады ім будзе не да пустога сёрфінгу ў інтэрнэце. Таксама, па словах Аляксандра Лукашэнкі, не трэба аберагаць дзяцей ад складанасцяў. У маладых людзей складаныя сітуацыі фарміруюць характар.

Наконт супрацьзаконнага кантэнту ў інтэрнэце Прэзідэнт выказаўся адназначна: такую інфармацыю трэба абмяжоўваць. І ў найбліжэйшы час у гэтай галіне будуць прыняты дадатковыя меры абароны.

Галоўны тэхнолаг Сяргей Традчык пацікавіўся, ці дастаткова змен у Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну для поўнага забеспячэння нацыянальнай бяспекі. «Мір вельмі дорага каштуе. Скажу шчыра, не як Прэзідэнт, нашы людзі не адчулі гэтую дарагоўлю міру. Я стараюся ўтрымліваць баланс, каб нашы людзі мелі магчымасць купіць паесці, мелі працу, маглі зарабіць і гэтак далей. Як я разумею, вам скажу: калі ў наш час чалавек жадае зарабіць больш, чым зарабляе, ён мае такую магчымасць», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што яшчэ 30 гадоў таму людзі марылі хоць 30 долараў зарабіць. Сёння ад гэтага сышлі і гэта забылі. І яшчэ 30 гадоў таму нашы людзі не маглі падумаць, што ў краіне будуць такія прадпрыемствы, як «БЕЛДЖЫ».

«Мір дорага каштуе, і трэба сказаць дзякуй расіянам, яны нам дапамаглі летась. Я нават не кажу

тут пра ядзерную зброю, якая ўсіх паставіла на месца. Як толькі ў Беларусі з'явілася ядзерная зброя, усе «крылы апусцілі». І суседзі ашалелыя нашы, і іншыя. Хаця не дай бог — не толькі мне, але і іншаму пакаленню палітыкаў — думаць аб ужыванні ядзернай зброі», — сказаў Прэзідэнт. Па словах кіраўніка дзяржавы, ад расіян было атрымана і шмат боепрыпасаў і ракет. Айчынны абаронна-прамысловы комплекс разгарнуў сваю вытворчасць. Беларусы таксама засвоілі шмат кампетэнцый, што стала добрым дадаткам да захаваных айчынных школ. І сёння досвед беларусаў запатрабаваны ва ўсім свеце.

«Космас, атамная станцыя — мы раней увогуле гэтым не займаліся. Цяпер па ўсім свеце будуем з расіянамі атамныя станцыі, раз'ехаліся нашы людзі. Адукацыя нашых людзей найвышэйшая, запатрабаваная ўсюды», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Таксама, па яго словах, развіваецца і абаронна-прамысловы комплекс — ёсць тэрытарыяльная абарона, выбудавана вытворчасць узбраення і боепрыпасаў.

«Мір дорага каштуе. За яго трэба плаціць. Але вы можаце не перажываць. Я не магу сказаць, што мы такія мудрыя, вялікія, так абароненыя — усялякае можа быць. Але я хачу сказаць, што мы ніколі не былі так абароненыя, наш народ і наша дзяржава, як цяпер. Як яно будзе, калі, не дай бог, успыхне вайна — усё гэта будзе залежаць ад нас. Сістэма выбудавана, ёсць Узброеныя Сілы, мабілізацыйны рэзерв, тэрытарыяльная абарона, народнае апалчэнне. Усё выбудавана. На дадзеным этапе ўсяго дастаткова», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што зменны ў Ваенную дактрыну і Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі звязаны з тымі пераменамі, якія адбываюцца сёння ў свеце. І, па яго словах, на дадзеным этапе ў гэтых вызначальных дакументах усяго дастаткова.

«Вы не перажывайце. Магу толькі сказаць у заключэнне: дайце мне эканоміку, а мір я забяспечу», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. На памяць аб сустрэчы яму падарылі аўтамабіль маркі «Белджылі». Але Аляксандр Лукашэнка даручыў старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандру Турчыну перадаць яго тым, каму гэта больш патрэбна, — ва ўстанову адукацыі ці аховы здароўя Мінскай вобласці.

Валерыя СЦЯЦКО.

Барысаўскі раён.

❍ У тэму

ЗАДАЧА НАПРУЖАНАЯ, АЛЕ БУДЗЕ ВЫКАНАНА З КАНКУРЭНТНАЙ ЦАНОЙ

Аб тым, як будзе выконвацца даручэнне Прэзідэнта аб вытворчасці да 1 студзеня 2025 года беларускага электрамабіля, журналістам расказаў віцэ-прэм'ер Пётр Пархомчык. Па яго словах, гэта напружаная задача, бо раней тэрміны былі вызначаны ў межах 2021—2025 года. Варта ўдакладніць, да 1 студзеня 2025 года трэба стварыць неабходныя тэхналагічныя магутнасці для вытворчасці тых кампанентаў, якія выкарыстоўваюцца ў электрамабілях. А з наступнага года ўжо падысці да серыйнай вытворчасці электрамабіля. Спецыялістаў чакае вялікая праца — маштабаваць вытворчасць кампанентаў для айчыннага электрамабіля, асвоіўшы пэўныя кампетэнцыі, якіх сёння няма. Напрыклад, па вытворчасці шасцерняў для высакахуткасных рэдуктараў. Цяпер беларускія вытворцы могуць вырабляць шасцерні для БелАЗаў, МАЗаў, грузавой тэхнікі, але не могуць вырабляць шасцерні для легкавога транспарту. Па словах Пятра Пархомчыка, да канца года трэба стварыць такія магутнасці па вытворчасці кампанентаў, выпусціць доследна-прамысловую партыю электрамабіляў і завяршыць усе працэсы, звязаныя з іх сертыфікацыяй.

У вытворчасці электрамабіля плануецца задзейнічаць беларускія прадпрыемствы, у тым ліку завод «Вымяральнік» і ААТ «Інтэграл», а таксама вытворчасць электрарухавікоў ААТ «Магілёўліфтмаш». Асноваў для электрамабіля стане кузаў першага беларускага аўтамабіля Belgee X50. Менавіта на гэтым заводзе будуць выконвацца зварачныя работы, фарбаванне і іншыя аперацыі, якія ўжо асвоены ў вытворчасці звычайнага легкавога аўтамабіля. Гэта дазволіць мінімізаваць выдаткі. Месца для даўкамплектавання электрамабіля яшчэ трэба вызначыць. «Я сёння не магу дакладна сказаць, дзе мы гэта будзем рабіць, але першыя доследныя ўзоры збяруць на гэтым прадпрыемстве. Мы завершым усе пытанні, звязаныя з выпрабаваннямі, і створым яшчэ адзін пункт, дзе ў далейшым будзе вырабляцца электрамабіль», — растлумачыў Пётр Пархомчык.

Што да самага важнага для спажыўца пытання — кошту будучага электрамабіля — то, па словах віцэ-прэм'ера, канкрэтыкі яшчэ няма. Але цана будзе канкурэнтнай.

«Мы ставім перад сабой мэту, што трэба стварыць тыя тэхналогіі, якія дадуць магчымасць нам атрымаць канкурэнтную цану. Для арыенціра можна браць кошт айчыннай Belgee X50, паколькі электрамабіль будзе на базе гэтай мадэлі, але канчатковы кошт будзе вызначаны пазней, калі стане вядома цана батарэі і іншых камплектуючых», — падкрэсліў ён.

Блізкая ўлада

Наталля КАЧАНАВА:

«КРАІНА — ГЭТА ЎСЕ МЫ!»

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з калектывам Мінскага трактарнага завода

«Мы разумеем, што сёння важна сустракацца з працоўнымі калектывамі, асабліва на буйных прадпрыемствах. Людзям цікавая работа Савета Рэспублікі, работа парламентарыяў», — зазначыла Наталля Качанава і дадала, што будзе ўдзячнай працаўнікам, калі тыя абазначаць пытанні, якія іх хвалююць. А таксама, магчыма, прапановы і пажаданні. Бо такая зваротная сувязь надта карысная і важная як для прадстаўнікоў улады, так і для работнікаў прадпрыемстваў.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Сустрэчы з працоўным калектывам папярэднічала сустрэча Наталлі Качанавай з кіраўніком прадпрыемства Віталем Воўкам, падчас якой генеральны дырэктар МТЗ паведаміў аб сённяшнім стане спраў на прадпрыемстве. Непасрэдна размова з работнікамі завода была надзвычай шчырай і адкрытай. Старшыня Савета Рэспублікі распавяла прадстаўнікам працоўнага калектыву пра работу, якую праводзіць парламент, спынілася на эканамічных дасягненнях, новых заканадаўчых ініцыятывах, знешнепалітычнай сітуацыі, а таксама засяродзіла ўвагу прысутных на выбарчай кампаніі. Яна адзначыла, што эканамічныя вынікі 2023 года станоўчыя, унутраны валавы прадукт склаў 103,9 %, фарміруецца бюджэт, што дазваляе выконваць усе сацыяльныя гарантыі дзяржавы — гэта і павышэнне пенсій, дапамог, павелічэнне мацярынскага капіталу і дастойная заработная плата чалавеку працы. «Вельмі важна цаніць сацыяльныя гарантыі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Гаворачы аб сучасных выклі-ках, яна паведаміла, што сёння назіраецца сур'ёзная небяспека працэсаў, якія адбываюцца ў свеце, асабліва на Блізкім Усходзе. Вельмі часта палітыкі сталі згадваць ядзерную вайну, і шэраг краін сёння не гатовы прытрымлівацца тых міжнародных дагавораў, якія былі дасягнуты раней. І ў сувязі з гэтым зазначыла: «Свет мяняецца, і за нашым Прэзідэнтам — мір і спакой у краіне. Сёння ёсць усё для таго, каб жыць спакойна. Але, канешне, гэта даецца няпроста. Тое, што робіць сёння наш Прэзідэнт — замежныя паездкі, выбудоўванне лагістыкі ў тыя дружалюбныя краіны, якія супрацоўнічаюць з намі, на Афрыканскі кантынент, — усё гэта для краіны». Таксама і кожны грамадзянін Беларусі павінен разумець і цаніць сваё мінулае, гісторыю, і сучаснае — тое, што стварылі сваёй працай за часы незалежнасці. А зроблена ж сапраўды нямала! І, па словах Наталлі Качанавай, калі будзе адзінства ў народзе, то ўсе выклікі і пагрозы сучаснасці пераадолець будзе намнога лягчэй.

На заканчэнне сустрэчы Наталля Качанава адказала на пытанні работнікаў завода і пажадала прадпрыемству стаць першым уладальнікам новаўведзенага Дзяржаўнага знака якасці.

Аб чым яшчэ гаварылі на сустрэчы — у найбліжэйшым нумары «Мясцовага самакіравання».

Уладзімір ВЯРЭНІЧ.

Урачыстасць

У ІХ РУКАХ — ЖЫЦЦЁ ЧАЛАВЕКА

У Дзень ратавальніка міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ ўручыў дзяржаўныя і ведамасныя ўзнагароды

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання найлепшых супрацоўнікаў ведамства адбылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У Зале Перамогі сабраліся найлепшыя ратавальнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Сярод іх — спецыялісты, якія займаюцца аварыйна-ратавальнай работай, і тыя, хто вырашае пытанні нагляду, прафілактыкі, агітацыі і прапаганды.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

«На працягу доўгіх гадоў станаўленне Беларусі ратавальнае ведамства дэманструе ўстойлівасць у забеспячэнні бяспекі, захоўвае і ратуе чалавечыя жыцці, — адзначыў Вадзім Сіняўскі, звяртаючыся да асабовага складу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Работа ратавальнікаў вельмі важная ў забеспячэнні бяспекі насельніцтва, аб'ектаў гаспадарання і эканомікі, культурнай спадчыны Беларусі. Я дзякую вам за нялёгкую, складаную, напружаную, але вельмі патрэбную работу».

Кіраўнік ведамства адзначыў сімвалічнасць правядзення цырымоніі ў Зале Перамогі музея. «Кожнаму чалавеку, які жыве ў нашай краіне, гасцям вельмі важна пабываць у гэтым месцы, — пераканан ён. — Не важна, колькі ты тут быў, у старым музеі ці новым, для нас гэтае месца знакавае не толькі з гістарычнага пункту гледжання. Гэта месца, якому трэба пакланяцца. Падзеі, якія адбываліся на нашай зямлі, неабходна памятаць, каб такіх трагедый у жыцці беларусаў ніколі не адбывалася».

Пасля ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання кіраўніцтва ведамства ўсклала кветкі да стэлы «Мінск — горад-герой».

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

НАТА правядзе найбуйнейшыя вучэнні, якія імітуюць пачатак трэцяй сусветнай вайны



На наступным тыдні НАТА пачне «найбуйнейшыя за апошнія дзесяцігоддзі» вучэнні Steadfast Defender — 2024. Пра гэта паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на галоўнакамандуючага альянсу ў Еўропе Крыстафера Кавалі. Чакаецца ўдзел каля 90 тысяч вайскоўцаў у вучэннях, якія працягнуцца некалькі месяцаў. Паводле інфармацыі іспанскага ABC, манеўры падразумяваюць імітацыю пачатку трэцяй сусветнай вайны пасля меркаванага нападу выдуманага суперніка, падобнага да Расіі і названага Occasus. У адказ на гэта Масква заяўляе, што не ўяўляе пагрозы, але сочыць за дзеяннямі, якія патэнцыйна небяспечныя для яе інтарэсаў, і выказвае гатоўнасць да дыялогу на раўнапраўнай аснове, падкрэсліваючы неабходнасць адмовы ад мілітарызацыі Еўропы. Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін адзначыў, што Расія не імкнецца да прамога ваеннага сутыкнення з НАТА, але гатовая да гэтага, калі нехта выкажа такія намеры.

Інфляцыя ў Японіі летась стала рэкордная за 41 год

У Японіі базавая спажывецкая інфляцыя па выніках мінулага года склала рэкордныя 3,1 працэнта. Гэта найвышэйшы паказчык за 41 год. Аб гэтым сведчаць статыстычныя даныя, якія апублікаваныя на сайце Міністэрства па адміністрацыйных справах і камунікацыях Японіі. У 2022 годзе інфляцыя ў краіне складала 2,3 працэнта. Ключавы паказчык, які адлюстроўвае рост цэн у краіне, уключае ў сябе кошт паліва, пры гэтым не ўлічваюцца цэны на свежыя прадукты. Асноўнымі прычынамі інфляцыі ў Японіі з'яўляюцца павышэнне кошту энерганосьбітаў і харчавання, а таксама паслабленне нацыянальнай валюты — ены.

Амерыканскі месяцавы карабель Peregrine згарэў над Ціхім акіянам

Амерыканскі прыватны месяцавы пасадачны модуль Peregrine у раёне поўначы ўвайшоў у шчыльныя пласты атмасферы Зямлі і згарэў над Ціхім акіянам, паведаміла «Бі-бі-сі». Няўдалая амерыканская прыватная месяцавая місія прабыла ў космасе ўсяго каля 10 дзён. Месяцавы пасадачны модуль Peregrine быў запушчаны на арбіту 8 студзеня з дапамогай ракеты-носьбіта цяжкага класа Vulcan кампаніі United Launch Alliance (ULA). У той жа дзень Astrobotic Technology паведаміла аб адмове рухальнай сістэмы, уцечцы паліва і пагрозе зрыву пасадкі на Месяц, намечанай на 23 лютага. Peregrine павінен быў стаць першым камерцыйным месяцавым пасадачным модулем і першым амерыканскім пасадачным модулем, які здзейсніў пасадку на Месяц, больш чым за 50 гадоў.

«Беларусь ні да аднаго народа не ставіцца як да свайго ворага»

Міністр абароны расказаў аб асноўных палажэннях новай Ваеннай дактрыны

Змест гэтага найважнейшага стратэгічнага дакумента Віктарам ХРЭНІНЫМ быў агучаны Прэзідэнту падчас пасяджэння Савета бяспекі, якое адбылося ў пачатку тыдня. У ходзе брыфінгу перад прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі кіраўнік абароннага ведамства засяродзіў увагу як на асноўных падыходах, закладзеных у абноўленай рэдакцыі Ваеннай дактрыны, якія дагэтуль з'яўляюцца актуальнымі, так і на новаўвядзеннях канцэптуальнага дакумента. Давязденне інфармацыі да шырокай, у тым ліку міжнароднай грамадскасці, сведчыць аб адкрытасці рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі Беларусі.

Фота БелТА.

Умовы, якія папярэднічалі ўдакладненню дакумента

Ваенная дактрына любой краіны — аснова яе ваеннай палітыкі. Яна адлюстроўвае стаўленне краіны да пытанняў вайны і міру, погляды дзяржавы на ролю сілавых сродкаў пры вырашэнні спрэчак на міжнароднай арэне, вызначае падыходы дзяржавы да выкарыстання арміі для абароны канстытуцыйнага ладу ад унутраных пагроз.

Міністр абароны патлумачыў, чаму сёння, калі ўвесь свет штарміць ад узнікаючых у розных яго кутках ваенных канфліктаў, вельмі важна інфармаваць беларускі народ, нашых суседзяў і ўсю сусветную грамадскасць аб асновах нашай ваеннай палітыкі, расказаць, чаму менавіта цяпер прынята рашэнне аб унясенні змяненняў у Ваенную дактрыну. «Усё проста: удакладненне палажэнняў дактрыны ажыццяўляецца, як правіла, ва ўмовах істотнай змены геапалітычнай сітуацыі або пры змене ўнутрыпалітычных умоў развіцця дзяржавы, — удакладніў Віктар Хрэнін. — Для Рэспублікі Беларусь на сённяшні момант усе такія ўмовы склаліся. Супрацьстаянне паміж Захадам і Усходам, якое адбываецца, перайшло ў «гарачую фазу». Радыкальна змяніліся ваенна-палітычная абстаноўка і палітыка-сілавая канфігурацыя ў Еўропе. Гаворачы аб унутрыпалітычных аспектах, галоўнай умовай перапрацоўкі дактрыны варта назваць рашэнне беларускага народа аб карэкціроўцы Канстытуцыі дзяржавы, прынятае на апошнім рэферэндуме. У адпаведнасці з ім змяніліся падыходы да нейтралітэту».

Вызначаны вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя — Усебеларускі народны сход, упаўнаважаны фарміраваць ваенную палітыку Рэспублікі Беларусь. Таксама распрацавана новая рэдакцыя Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі — аднаго з асноўных дакументаў, які складае базіс Ваеннай дактрыны. Перапрацоўку дакумента таксама абумовіла развіццё нацыянальнай тэорыі ваеннага мастацтва. Усе пералічаныя ўмовы запатрабавалі па-новаму ўдакладніць палажэнні ваеннай палітыкі Беларусі.

«Нягледзячы на глыбокую перапрацоўку змястоўнай часткі, дакумент захаваў у сабе міралюбівыя памкненні беларускага народа, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства. — Важны пасыл новай Ваеннай дактрыны — Рэспубліка Беларусь ні да аднаго народа не ставіцца як да свайго ворага, незалежна ад дзеянняў урадаў гэтых дзяржаў».

Дарэчы, распрацаваны дакумент — гэта не толькі погляд ваеннаслужачых. У рабоце над дактрынай удзельнічалі практычна ўсе дзяржаўныя органы. Больш за тое, на этапе ўзгаднення праекта дакумента да работы падключыліся і мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Шырока абмяркоўваўся і дэталёва вывяраўся праект Ваеннай дактрыны парламентарыямі. З улікам усіх унесеных змяненняў і дапаўненняў распрацаваны праект Ваеннай дактрыны з'яўляецца новым дакументам.

Недапушчэнне ваенных канфліктаў і баланс нацыянальных інтарэсаў

Міністр абароны агучыў асноўныя новаўвядзенні Ваеннай дактрыны.

Першае. «Абноўленая Ваенная дактрына можа служыць асновай для ўрэгулявання сітуацыі ў Еўропе і запуску мірнага дыялогу. Перш за ўсё, мы прадэманстравалі зацікаўленасць Рэспублікі Беларусь у аднаўленні ўплыву міжнародных арганізацый па бяспецы (такіх як ААН, АБСЕ і іншых), эфектыўным іх функцыянаванні па прадухіленні і вырашэнні ўзброеных сутыкненняў. У праекце дактрыны мы гаворым аб тым, што Рэспубліка Беларусь адкрыта да супрацоўніцтва ў ваеннай сферы з любымі дзяржавамі, у тым ліку і з дзяржавамі НАТА. Мы гатовы аднавіць прагматычны дыялог пры ўмове спынення гэтымі дзяржавамі агрэсіўнай рыторыкі і дзеянняў у дачыненні да нас».

Другое. «У дактрыне важны акцэнт зроблены на недапушчэнне ваенных канфліктаў. У пералік ваенных небяспек уключана магчымасць прымянення апанентамі ваеннай сілы супраць Рэспублікі Беларусь ужо ў мірны час, ва ўмовах ваенна-палітычнага крызісу. Гэта тое, з чым мы сутыкаемся ў цяперашні час на нашых паўднёвых і заходніх рубяжах. Вядома, самі па сабе правакацыі, узброеныя акцыі і інцыдэнты з боку нашых суседзяў не з'яўляюцца ваенным канфліктам. Але рэагаваць на іх неабходна. І ў першую чаргу мерамі стратэгічнага стрымлівання, што мы цяпер і робім, паказваючы высокую баявую гатоўнасць усіх кампанентаў ваеннай арганізацыі дзяржавы».

Трэцяе. «Мы ўдакладнілі тыпалогію ваенных канфліктаў для ўмоў Рэспублікі Беларусь, адмовіліся ад іх градацыі па маштабах. Замест лакальных і рэгіянальных войнаў у новай дактрыне разглядаюцца міждзяржаўныя і кааліцыйныя войны. Бо для Рэспублікі Беларусь любая вайна, няхай лакальная ці рэгіянальная, будзе ахопліваць усю тэрыторыю дзяржавы і запатрабуе напругі ўсіх сіл. Пры гэтым, замацоўваючы паняцце «міждзяржаўная вайна», мы робім важную палітычную заяву, што Рэспубліка Беларусь гатовая самастойна адстойваць свае жыццёва важныя нацыянальныя інтарэсы. У паняцце «кааліцыйная вайна» мы закладваем сэнс, што дасягненне перамогі ў ёй будзе ажыццяўляцца прымяненнем беларускіх войскаў сумесна з войскамі саюзнікаў».

Чацвёртае. «У новай Ваеннай дактрыне дакладна пазначана, што абарону дзяржавы і забеспячэнне яе ваеннай бяспекі ажыццяўляюць усе: пачынаючы ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, заканчваючы кожным грамадзянінам краіны. Рэгламентавана вертыкаль дзяржаўнага кіравання ў рамках гарантавання ваеннай бяспекі і абароны дзяржавы. Нароўні з функцыямі ўзброенай абароны, якую ажыццяўляе сілавы кампанент ваеннай арганізацыі дзяржавы, абазначана месца і роля ўсіх іншых дзяржаўных органаў. Тут і дыпламатычныя намаганні нашых міністэрстваў, ведамстваў і грамадскіх арганізацый, меры ў эканамічнай і інфармацыйнай сферах. У прыватнасці, мы будзем тлумачыць сваім грамадзянам і сусветнай супольнасці правамернасць і справядлівасць нашых дзеянняў па абароне сваёй краіны».

Пятае. «Мы сабралі разам і прапісалі ўсе нашы погляды па выкананні саюзных абавязацельстваў. Гэта даўно ляжала на паверхні і патрабавала рэалізацыі. З'явілася цэлая асобная глава, якая фарміруе прававую аснову для нашых дзеянняў у выпадку ўзброенай агрэсіі супраць нашых саюзнікаў па АДКБ і Саюзнай дзяржаве. У гэтай жа главе мы прапісалі магчымасць удзелу Рэспублікі Беларусь у міратворчай дзейнасці пад эгідай міжнародных арганізацый па бяспецы».

Шостае. «Адэкватнасць мер, якія прымаюцца дзяржавай, у адпаведнасці з узроўнем ваеннай небяспекі. У абноўленай дактрыне яны накіраваны на недапушчэнне эскалацыі ваенна-палітычнага становішча, разрадку сітуацыі. А самае галоўнае, праект Ваеннай дактрыны дае адназначны пасыл — мы не павінны дапусціць сітуацыі, калі рэагаваць ужо будзе позна. Менавіта таму ўпор зроблены на стрымліванне ад развязвання ваенных канфліктаў. Яно ажыццяўляецца выбудоўваннем сістэмы адносін, якія стрымліваюць працэсы ўзнікнення міждзяржаўных супярэчнасцяў, падтрыманнем балансу нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь з інтарэсамі іншых краін, якія забяспечваюць стабільнасць і мірнае суіснаванне. І ў гэтым плане размяшчэнне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тактычнай ядзернай зброі разглядаецца як важны складнік прэвентыўнага стрымлівання патэнцыйных праціўнікаў ад развязвання ўзброенай агрэсіі супраць Рэспублікі Беларусь. Гэта наша вымушаная мера».

Сёмае. «Новае гучанне ў дактрыне атрымалі пытанні эканамічнага забеспячэння ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны. Адлюстравана наша супрацьдзеянне санкцыям, накіраванасць абароннага сектара эканомікі краіны на імпартазамяшчэнне з адначасовым развіццём ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з саюзнікамі. Пашыраны змест кірункаў ваеннага будаўніцтва. Яны ўжо не абмежаваны пытаннямі фарміравання і аснашчэння сілавых кампанентаў ваеннай арганізацыі. Сюды ўвайшлі пытанні падрыхтоўкі дзяржаўных органаў да абароны, мабілізацыйнай падрыхтоўкі эканомікі і насельніцтва краіны, аператыўнага абсталявання яе тэрыторыі».

«Мы гатовы абараняць сваю краіну ўсімі сіламі і сродкамі»

Рэзюмуючы ўсё вышэй сказанае, Віктар Хрэнін падкрэсліў, што Ваенная дактрына атрымалася ўзважаным і вывераным дакументам, які адпавядае нашай Канстытуцыі і міжнародным абавязацельствам, якія ўзяла на сябе Беларусь.

«Прыняцце абноўленай дактрыны дазволіць, па-першае, данесці да міжнароднай грамадскасці міралюбівую палітыку і адсутнасць варожасці да каго-небудзь, — адзначыў міністр абароны. — Адначасова акрэсліць дакладны пасыл — мы гатовы абараняць сваю краіну ўсімі сіламі і сродкамі, у тым ліку з нашымі ваеннымі саюзнікамі па Саюзнай дзяржаве і АДКБ. Па-другое, планамерна развіваць і будаваць ваенную арганізацыю краіны, рыхтаваць дзяржаўныя органы да абароны, вучыць грамадзян абараняць сваю Айчыну. Па-трэцяе, дзяржаўнай вертыкалі — прымаць рашэнні і кіраваць працэсамі забеспячэння ваеннай бяспекі: як у мірны час, так і абаронай падчас ваенных дзеянняў. Пры гэтым рэалізоўваць нароўні з узброенай абаронай шырокі спектр неваенных мер, накіраваных на перамогу ў вайне і завяршэнне яе на прымальных умовах для Рэспублікі Беларусь».

У адказ на заявы заходніх псеўдааналітыкаў, гаваруноў і проста экстрэмістаў, якія ўжо амаль тыдзень не змаўкаюць, выдаючы розныя прагнастычныя сцэнарыі і ацэнкі праекту новай Ваеннай дактрыны і адносінам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, у тым ліку па пытаннях прымянення ядзернай зброі, Віктар Хрэнін давёў пазіцыю ваеннага ведамства. «Я яшчэ раз усім заяўляю: ворагаў у нас няма, — акцэнтаваў увагу ён. — У сваёй палітыцы мы ні на каго не азіраемся і падстройвацца не збіраемся. У нас ёсць інтарэсы нашых народаў, ёсць узаемныя саюзніцкія абавязацельствы. І толькі гэтыя фактары будуць стаяць на чале ўсіх нашых рашэнняў і дзеянняў: як самастойна, так і ў рамках Саюзнай дзяржавы».

Праект Ваеннай дактрыны будзе вынесены на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу.

Вераніка КАНЮТА.

Гонар краіны

СЛУЖБА Ў ТАНДЭМЕ

Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў лаўрэатаў спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва

Вось пра каго сапраўды скажаш: на работу — як на свята. Мерапрыемствы з удзелам кіраўніка дзяржавы, сустрэчы замежных дэлегацый, суправаджэнне дзяржаўных свят і шматлікіх цырымоній... Іх сінхроннасць і бездакорнасць, музычнасць і зладжанасць заварожваюць з першага погляду і з першай ноты. Імі немагчыма не захапляцца і не ганарыцца. І калі 1-я і 2-я роты ганаровай варты — візітная картка Беларусі, то аркестр ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры — яе гучанне і меладычнасць.

Яны не толькі ў тандэме выконваюць пастаўленыя задачы. Яны разам і на пляцы, і ў казарме, і нават у зносінах з падрастаючым пакаленнем — спецыяльная прэмія Прэзідэнта воінскім падраздзяленням была ўручана менавіта за значныя дасягненні ў патрыятычным выхаванні моладзі, актыўны ўдзел у палітычных і культурных мерапрыемствах. Карэспандэнты «Звязды» завіталі ў Мінскую ваенную камендатуру і паназіралі за кулуарным жыццём тых, хто заўсёды навідавоку.

Самыя прыгожыя і стойкія

Нягледзячы на густы снег, ваеннаслужачыя элітнага падраздзялення Узброеных Сіл — роты ганаровай варты — адточваюць элементы з карабінамі для парада войскаў Мінскага гарнізона, які пройдзе ў рамках святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Падзея будзе не хутка, але патрабуе старанной падрыхтоўкі. Пры гэтым ніхто не адмяняў і асноўную задачу — забеспячэнне дзяржаўных мерапрыемстваў і ўрачыстасцяў, таму кожная хвіліна ў ваеннаслужачых на вагу золата.

Хлопцы — як на падбор: прыгожыя, высокія, стройныя. І гэта абумоўлена спектрам задач, ускладзеных на іх. Патрабаванні да знешнасці ваеннаслужачых роты ганаровай варты вельмі сур'ёзныя. Рост — не ніжэй за 185 сантыметраў, правільныя рысы твару, адсутнасць на целе шрамаў і татуіровак. Сярод крытэрыяў строгага адбору — і першая група здароўя, маральна-дзелавыя якасці, чысціня перад законам і, самае галоўнае, жаданне кандыдата праходзіць службу ў падраздзяленні.

Нягледзячы на тое, што ваеннаслужачыя роты ганаровай варты не ажыццяўляюць скачкоў з парашутам і не выконваюць спецыяльныя задачы, нагрузка на іх кладзецца не меншая, чым, напрыклад, на тых жа дэсантнікаў або разведчыкаў. Гадзінамі яны стаяць у нерухомым становішчы на цырымоніях і мерапрыемствах. Пры гэтым не баяцца ні дажджу, ні моцнага марозу, ні санцапёку. Без адзінай недакладнасці і затрымкі яны сінхронна ўскладаюць вянкі, якія могуць важыць па 30—40 кілаграмаў. За ўсёй гэтай знешняй прыгажосцю і дасканаласцю — каласальная праца, якая патрабуе як фізічных, так і маральных намаганняў. Іх па праве можна назваць самымі стойкімі і цярплівымі вайскоўцамі ва Узброеных Сілах.

Нягледзячы на выкананне задач, якія суправаджаюць штодзённымі тэрыторыямі, ваеннаслужачыя праспяваюць дзяліцца сваім вопытам з падрастаючым пакаленнем. У прыватнасці, дапамагаюць асвойваць прыёмы страявой падрыхтоўкі школьнікам, якія нясуць вахту памяці каля Вечнага агню ў Мінску (пост № 1), рыхтуюць хлопцаў і дзяўчат для спаборніцтваў. У тым ліку гэтая дзейнасць ваеннаслужачых была адзначана спецпрэміяй Прэзідэнта.

— Вялікі гонар — атрымаць такую высокую ацэнку ад кіраўніка дзяржавы, — дзеліцца ўражаннямі **камандзір 2-й роты ганаровай варты Мінскай ваенной камендатуры капітан Максім ДАШКЕВІЧ.** — Адна справа — забяспечваць мерапрыемствы ў непасрэднай блізкасці да Прэзідэнта, што было не адзін раз, іншая — атрымліваць такую высокую ўзнагароду з яго рук. Хвалявання не было, у большай ступені прысутнічала пачуццё адказнасці.

Навыкі, якія спатрэбяцца ў жыцці

У лютым роце ганаровай варты споўніцца 29 гадоў. Праз гэту школу стойкасці і мужнасці прайшлі сотні маладых людзей. Безумоўна, для кожнага з іх гады, праведзеныя ў элітным падраздзяленні Узброеных Сіл, не прайшлі дарэмна. Многія знайшлі тут справу па душы і заключылі з воінскім падраздзяленнем кантракт. Аднак у прыярытэце — ваеннаслужачыя тэрміновай ваеннай службы.

Яфрэйтар Кірыл Мароз служыць у роце ганаровай варты год і пяты месяц. Пасля арміі плануе вярнуцца да выканання сваіх прафесійных абавязкаў. Малады чалавек — фельчар-акушэр, да службы працаваў на хуткай медыцынскай дапамозе ў Мінску. Кірыл упэўнены, што вопыт, атрыманы ў роце ганаровай варты, абавязкова спатрэбіцца. «Тут удалося атрымаць добрую фізічную падрыхтоўку, што мне вельмі неабходна ў маёй прафесійнай дзейнасці, — кажа ён. — Бываюць складаныя пацыенты, якіх трэба падымаць, насіць. Не заўсёды ў дамах працуюць ліфты, а неабходна хутка падняцца ў патрэбную кватэру, каб аказаць чалавеку медыцынскую дапамогу. У жыцці заўсёды спатрэбяцца набытыя падчас службы дысцыплінаванасць, імкненне да парадку ва ўсім».

Па словах Кірыла, ён хутка прызвычаіўся да нагрузак, якія даюцца ў падраздзяленні. «Калі ў цывільным жыцці ніякім відам спорту не займацца, то першапачаткова будзе няпроста, — заўважае ваеннаслужачы. — Я 11 гадоў займаўся футболам, таму мне было нескладана. Аднак камандзіры з разуменнем ставяцца да салдат, таму павялічваюць нагрузку паступова, падыходзяць індывідуальна да кожнага вайскоўца».

Кірыл лічыць, што самае складанае ў службе ваеннаслужачага роты ганаровай варты — трэніраваць вытрымку і цярпенне. «У цывільным жыцці няма такіх сітуацый, калі трэба стаяць не рухаючыся, — кажа ён. — Тут жа пры выкананні воінскіх рытуалаў мы часта стаім без руху. Як у нас гэта атрымліваецца? Самае галоўнае — трэба выкінуць з галавы ўсялякія думкі. Проста стаяць і не рухацца, прыгожа трымаць спіну. Калі я адразу настрою сябе, што мне будзе лёгка, то так і будзе: і на холадзе, і на спёцы».

Строгі адбор і музычная фундаментальнасць

У непагадзь аркестр ганаровай варты аддае перавагу трэніроўкам у памяшканні. Ваенныя музыкі ведаюць, як ападкі або спёка ўплываюць на гучанне, а таму берагуць свае інструменты. Калі даводзіцца выступаць на вуліцы ў дрэннае надвор'е, то ў ход ідуць праверэныя метады, якія дазваляюць захаваць гучанне інструментаў максімальна арыгінальным.

Аркестр ганаровай варты з'яўляецца класічным духавым аркестрам. Сярод яго задач — забеспячэнне мерапрыемстваў з удзелам кіраўніка дзяржавы, суправаджэнне замежных дэлегацый, кіраўнікоў дзяржаў, адкрыццё помнікаў, мемарыялаў. Без удзелу аркестра не абыходзяцца многія рэспубліканскія ўрачыстасці. Знаходзяць музыкі час і на канцэртную дзейнасць.

У калектыве — звыш 30 музыкаў. Практычна ўсе з іх, за выключэннем дзвюх салістак, — ваеннаслужачыя. Перш чым трапіць у аркестр, музыкі праходзяць сур'ёзны адбор. «Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, то ў нас усё пачынаецца з праслухоўвання, — адзначае **ваенны дырыжор — начальнік аркестра ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры капітан Ілья КУПРЭЕЎ.** — Збіраецца камісія з ліку музыкаў, і ў большай ступені менавіта яны вырашаюць, ці папоўніць канкрэтны чалавек калектыў. Калі маіх калег чалавек не задавальняе па прафесійных якасцях, але мне ён падыходзіць, мы яго не возьмем, бо менавіта маім падначаленым стаяць з патэнцыяльным кандыдатам у страі і выконваць пастаўленыя задачы».

Ілья Купрэеў узначальвае аркестр чацвёрты год. У калектыў ён трапіў па размеркаванні. За плячыма музыкі ў пагонах — навучанне ў Магілёўскім дзяржаўным музычным каледжы імя Рымскага-Корсакава, Ваенным інстытуце (ваенных дырыжораў) Ваеннага ўніверсітэта імя А. Неўскага Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Спачатку быў намеснікам начальніка аркестра, праз год стаў яго кіраўніком. Калі гэта дазваляюць абставіны, не ўпускае магчымасці паіграць на музычным інструменце. Па спецыяльнасці ён — саксафаніст. Лічыць, што ў асваенні гэта адзін з самых лёгкіх музычных інструментаў.

У калектыў, як правіла, трапляюць пасля заканчэння сярэдніх спецыяльных музычных каледжаў. Многія адразу заключаюць з воінскім падраздзяленнем кантракт і замест паўтарагадовага тэрміну служаць два гады. «Гэтага перыяду дастаткова, каб навучыцца самастойнасці, — лічыць Ілья Купрэеў. — Яны атрымліваюць добры заробак, жывуць не ў казарме. Ахвотныя маюць магчымасць атрымаць у заочнай форме вышэйшую адукацыю. Акрамя таго, яны маюць усе ваенныя льготы. Два гады — выдатны час разабрацца ў сабе, зразумець, чаго ты хочаш ад жыцця».

На базе аркестра створаны біг-бэнд, квартэт саксафонаў і брас-квінтэт (музычны ансамбль, які складаецца з пяці музычных інструментаў). У сваёй творчасці музыкі нярэдка звяртаюцца да моладзі. «Сучасныя маладыя людзі не вельмі цікавяцца класічнай музыкай, — заўважае начальнік аркестра ганаровай варты. — І задача ваенных аркестраў — знайсці да іх падыход, сыграць на гэтых тонкіх струнах душы, каб чалавек, які дагэтуль слухаў «музычнае смецце», павярнуўся тварам да больш важных, фундаментальных рэчаў».

Як адзіны механізм

Калектыў аркестра малады. Сярэдні ўзрост музыкаў у пагонах — 30+. Але ёсць і больш старэйшыя калегі, якія дзеляцца вопытам з моладдзю. Юрый Кузняцоў — старажыл ваеннага калектыву. У аркестр ён прыйшоў 24 гады таму пасля заканчэння Мазырскага музычнага вучылішча. Цяпер старшы прапаршчык — канцэртмайстар аркестра ганаровай варты, правая рука яго кіраўніка. Юрый Анатольевіч вырашае ўсе арганізацыйныя задачы, адказвае за тылавое забеспячэнне вайскоўцаў. А яшчэ па сумяшчальніцтве ён саксафаніст. «Жыццё не стаіць на месцы, таму, вядома, з пачатку існавання аркестра памянялася многае, — расказвае Юрый Кузняцоў. — Мы працуем у камфортных умовах, іграем на новых музычных інструментах, нават транспарт у нас ёсць свой».

Нягледзячы на тое, што асноўныя задачы ваеннаслужачых аркестра звязаны з музычнай дзейнасцю, прысутнічае ў іх жыцці і баявая падрыхтоўка. У гэтым іх галоўнае адрозненне ад цывільных музыкаў. «На заняткі па баявой падрыхтоўцы ў нас ідзе менш часу, чым у іншых падраздзяленнях, але гэта не перашкаджае нам быць фізічна вынослівымі і выдатна карыстацца зброяй, — удакладняе Ілья Купрэеў. — Калі запатрабуе час і абставіны, ваенныя музыкі памяняюць свае музычныя інструменты на аўтаматы і стануць на абарону Айчыны».

Фота Лізаветы ГОЛАД.

У ЛАБІРЫНТАХ ФОНДАСХОВІШЧАЎ

Пачалося ўсё з экскурсіі па галоўным беларускім сховішчы твораў выяўленчага мастацтва. Напачатку **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце Вікторыя КУЗЬМІНА** расказала пра новыя праекты. 2024 год праходзіць у музеі пад знакам яго 85-гадовага юбілею, цікавыя выставы падрыхтуюць да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Згодна з Канцэпцыяй, у якой прадугледжваецца і культурнае развіццё рэгіёнаў, пачне дзейнічаць перасоўная выстава з шэдэўрамі з фонду музея.

Потым журналісты па асаблівым дазволе былі запрошаныя туды, куды звычайны наведнік ніколі не трапіць: у фондасховішчы і рэстаўрацыйныя майстэрні.

«Правадніком» па таемным свеце фондасховішчаў стаў для журналістаў **старшы навуковы супрацоўнік Арцём ЛАПІЦКІ.** Усяго ў музеі больш за 37 тыс. экспанатаў. І нягледзячы на велізарныя плошчы музея, якія ўсё павялічваюцца і павялічваюцца, у пастаянную экспазіцыю патрапляе 3-4 працэнты, каля тысячы твораў-шчасліўчыкаў... Адбіраюць унікальнае, найлепшае. Але нешта вартае проста не змяшчаецца ў лік адабраных. Гэта нармальная практыка для ўсіх буйных музеяў свету — тое, што мы бачым у залах, толькі вяршыня айсберга.

Паглядзець на «падводную частку» таго айсберга журналісты і атрымалі магчымасць... Хоць у музеі зважаюць на камфорт наведнікаў, галоўнае тут — здароўе «гаспадароў», мастацкіх твораў. У галоўным корпусе пануе «вечная вясна» — тэмпература і вільготнасць тут адпавядаюць гэтай пары года, так камфортней для экспанатаў. У фондасховішчы ж большую частку часу цёмна і таксама — «веснавое паветра». Дапусцілі нас туды, дзе захоўваецца калекцыя беларускага жывапісу. Карціны размешчаныя на вертыкальных металічных рухомых стэлажах, так званых касетных, — на кожным з двух бакоў развешаныя карціны. Маленькія, вялікія, кожная са сваёй гісторыяй... А яшчэ тут пануе пах алейнай фарбы.

Для гасцей падрыхтаваная неспадзяванка ў гэтай скарбніцы: кожны можа выбраць карціну на свой густ для стварэння імправізаванай часовай выставы «Беларускае мастацтва вачыма журналістаў». «Звязда» спыніла выбар на пейзажы народнага мастака Беларусі Віталя Цвіркі і жаночым партрэце аўтарства Уладзіміра Сулкоўскага.

ДЗЕ Б'ЕЦЦА СЭРЦА МУЗЕЯ

Сэрцам музея супрацоўнікі назвалі рэстаўрацыйныя майстэрні.

— Усе творы, якія ў нас захоўваюцца, — жывыя, яны маюць уласцівасць мяняцца, нават нягледзячы на ідэальныя ўмовы для іх захавання, — тлумачыць Арцём Лапіцкі. — Таму, каб твор трапіў на выставу, перад яе фарміраваннем захавальнік фонда аглядае карціну разам з музейным супрацоўнікам, а тады яе павінен агледзець рэстаўратар. Творы, якія патрабуюць падрыхтоўкі да выставы, патрапляюць у рэстаўрацыйныя майстэрні.

У музеі самы вялікі ў краіне і самы кампетэнтны рэстаўрацыйны комплекс, два дзясяткі спецыялістаў здольны выратаваць самыя «застарэлыя» хваробы карцін, скульптур, малюнкаў ды ўвогуле любых мастацкіх вырабаў.

— Так, кожны твор перад экспанаваннем праходзіць праз нас, — паведамляе **загадчык сектара алейнага жывапісу Цімафей ПАЛУНІН.** — Займаемся і кансервацыяй — гэта захаванне твора ў той стадыі, у якой ён патрапіў да нас, нейтралізацыя разбуральных працэсаў. Наступны этап — рэстаўрацыя, самае складаное і цікавае. Часцей за ўсё, яна планавая. Бо чарга на рэстаўрацыю можа заняць ад двух месяцаў да двух гадоў. На жаль, і праца над нейкім творам можа доўжыцца гады. Твор можа пацямнець ад вільгаці, быць абпаленым... Драпіны, трэшчыны, асыпанні... Рэстаўратару важна дабіцца таго вобраза, які першапачаткова заклаў мастак.

Светлае, прасторнае памяшканне рэстаўрацыйнай майстэрні. Вось да сцяны прыхілены «вылечаныя пацыенты» — палотны Гаўрыіла Вашчанкі і Фірса Жураўлёва. А яркае палатно на рэстаўрацыйным стале — абстаноўка, дарэчы, вельмі нагадвае аперацыйную кардыёлагаў — з «жорсткім кракелюрам», гэта значыць усё ў трэшчынах. Чаму? Як патлумачыў Цімафей Палунін, жывапіс — гэта бутэрброд. Ніжні ўзровень — палатно, потым ідзе слой праклейкі, слой грунту, слой фарбы, слой лаку... І кожны з гэтых слаёў рэагуе на знешнія ўмовы па-рознаму. Палатно расцягваецца, грунт — меней... Калі з-за вільгаці і змены тэмператур палатно расцягнецца, яно разарве слой фарбы, а з часам пачынаюцца асыпанні.

НА ФОНЕ СТАРАЖЫТНЫХ АБРАЗОЎ

Сярод дасягненняў рэстаўратараў, якімі яны ганарацца, — аднаўленне старажытных беларускіх абразоў і драўлянай храмавай скульптуры. Вось на фоне гэтых рарытэтаў, у зале старажытнага беларускага мастацтва, адбылася галоўная размова дня: прэзентацыя Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства ў 2024—2026 гадах.

— Канцэпцыя шырока абмяркоўвалася, выказваліся самыя розныя заўвагі — што таксама добра, бо сведчыць, што праект нікога не пакідае абыякавым, закранае і нейкія балючыя пункты сферы культуры, — заўважыў мадэратар сустрэчы, **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН.** — Развіццё беларускай культуры як з'явы — гэта агульныя намаганні. Менавіта таму Міністэрства культуры і ініцыявала такі шырокі дыялог, у якім бяруць удзел прадстаўнікі самых розных устаноў.

Ірына ДРЫГА, начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры, адзначыла, што гісторыя Канцэпцыі пачалася з паслання кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, дзе было пастаўлена пытанне пра культурнае імпартазамяшчэнне.

— Гэта не азначае, што, прымаючы такі дакумент, Рэспубліка Беларусь аспрэчвае сусветную культуру, сусветную культурную спадчыну. Мы клапоцімся пра сваю культурную бяспеку і культурны суверэнітэт, пра тое, як паказаць усяму свету, хто мы, беларусы, і чым можам ганарыцца, і хочам дапамагчы нашым грамадзянам усвядоміць сябе беларусамі. Беларускі лад жыцця павінен стаць звыклым для нашага грамадзяніна, пачынаючы з аднолькава добрага валодання абедзвюма дзяржаўнымі мовамі, ведання традыцый, спажывання беларускага культурнага прадукту.

Слова «культура», дарэчы, паходзіць, калі звярнуцца да антычных крыніц, ад слова «культываваць», апрацоўваць зямлю. І азначае апрацоўку душы чалавечай. Пра гэта згадаў протаіерэй **Ігар Васько, старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы.** Так, быў час, калі рэлігія вызначала развіццё культуры, але і цяпер узаемадзеянне культуры з Царквой адбываецца на розных узроўнях.

— Мы не павінны трактаваць культуру толькі як спадчыну — гэта і жывая традыцыя, тое, што ствараецца сёння, — лічыць Ігар Васько. Протаіерэй параіў журналістам звярнуць увагу на работу сучасных іканапісных школ, на тое, як сёння аздабляюцца храмы Беларусі, — а гэта павінна адбывацца з веданнем не толькі царкоўных канонаў, але і з навуковым падыходам, зваротам да гісторыі, беларускіх культурных традыцый.

Марыя НЕЦВЯТАЕВА, намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела арганізацыі і ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў Міністэрства культуры, згадала пра вялікае значэнне для культуры Беларусі роспісаў Спаса-Праабражэнскага сабора ў Полацку, дзе пры падтрымцы дзяржавы была праведзеная каласальная работа па раскрыцці роспісаў. Па іх можна прасачыць станаўленне нацыянальнай іканапіснай школы. Маем і сведчанні высокага ўзроўню адукацыі прападобнай Еўфрасінні Полацкай — незвычайныя сюжэты фрэсак, заснаваных на малавядомых момантах агіяграфічнай літаратуры, напрыклад, выява кентаўра з «Жыція» святога Антонія Вялікага.

Марыя Нецвятаева таксама расказала пра ўключэнне беларускіх аб'ектаў у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Нядаўна туды патрапіла беларускае саломапляценне, на 2024 год прынята на разгледжанне наша выцінанка. Падрыхтаваныя дасье па неглюбскай традыцыі ткацтва, ідзе работа па падрыхтоўцы дасье па выканальніцкіх традыцыях ігры на дудзе. Што датычыцца Спіса матэрыяльнай сусветнай спадчыны, то зараз для ўключэння туды рыхтуюцца дакументы на Каложскую царкву, царкву ў Сынкавічах і касцёл у Камаях, а таксама Брэсцкую крэпасць — з боку ЮНЕСКА знята вета на ўключэнне ў Спіс аб'ектаў, звязаных з нядаўнімі ваеннымі канфліктамі.

— Канцэпцыю мы прымаем не для таго, каб мы закрыліся, а для таго, каб мы змаглі добра прэзентаваць сябе на міжнародным узроўні, — лічыць Марыя Нецвятаева.

ПРА МОВУ, ЛІТАРАТУРУ І ГІСТОРЫЮ

Мова — адзін з найважнейшых элементаў культуры, нагадаў **дырэктар інстытута моезнаўства імя Якуба Коласа Ігар КАПЫЛОЎ.** Канцэпцыя сыходзіць з таго, што абедзве дзяржаўныя мовы заслугоўваюць аднолькавай павагі і ўвагі. Ігар Капылоў закрануў праблему экспансіі замежных слоў у абедзве дзяржаўныя мовы. З гэтай нагоды інстытутам плануецца круглы стол. Не менш важнае пытанне — ужыванне ненарматыўнай лексікі ў грамадстве, асабліва ў асяроддзі моладзі.

— Праз мову мы сведчым пра багацце нашай беларускай нацыянальнай культуры, — сцвярджае Ігар Капылоў. — І адказваем за захаванне нормаў літаратурнай мовы, якія, на жаль, парушаюцца на ўсіх узроўнях, таму мы рыхтуем цэлы комплекс нарматыўных даведнікаў.

А да Дня роднай мовы адбудзецца агульнанацыянальная дыктоўка, тэкст якой, хутчэй за ўсё, прысвецяць 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Вынікам увасаблення Канцэпцыі сярод іншага стане філалагічная культура грамадства і развіццё сучаснай літаратуры, адзначыў **Іван САВЕРЧАНКА, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы.** А яшчэ Канцэпцыя — стымул для міжнароднага супрацоўніцтва, будзе спрыяць кансалідацыі грамадства, вяртанню гістарычнай спадчыны. Праекты прадуманыя, рэалістычныя, прапанаваныя людзьмі, якія ведаюць сваю справу. Як прыклад папулярызацыі літаратурнай спадчыны з падтрымкай дзяржавы Іван Саверчака назваў серыю «Залатая калекцыя беларускай літаратуры», дзе сабраныя шэдэўры ад старажытнасці да сучаснасці.

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ, начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі, звярнуў увагу на праблему культуры чытання: тое, што кніга пераходзіць у інтэрнэт, зніжае якасць тэкстаў. Развіццю сучаснай беларускай літаратуры, на думку Уладзіміра Андрыевіча, спрыяюць Нацыянальная літаратурная прэмія і ЛітUP, праект у рамках Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, дзякуючы якому творчы чалавек нават з рэгіёна можа выдаць таленавітую кнігу.

Анатоль ГЛІНСКІ, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі праблем выхавання асобы Навукова-даследчага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі, распавёў пра дапаможнікі па патрыятычным выхаванні дзяцей. **Павел ТРУБЧЫК, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі,** прадставіў праекты інстытута ў рамках Канцэпцыі: напрыклад, дзеля папулярызацыі рэгіянальнай гісторыі запланаваны чатыры навукова-практычныя канферэнцыі ў рэгіёнах. **Аляксандр БАРАНОЎСКІ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,** заклікаў прадстаўнікоў СМІ больш актыўна асвятляць мерапрыемствы Акадэміі навук.

— Канцэпцыя атрымалася глыбокім ідэалагічным дакументам, з шырокім спектрам дзейнасці, — падсумавала **Ірына КАРПОВІЧ, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры.**

Напрыканцы мерапрыемства ўсе ўдзельнікі змаглі паглядзець і абмеркаваць толькі што створаную выставу «Беларускае мастацтва вачыма журналістаў», якая будзе працаваць на працягу двух тыдняў.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Вернісаж

Аб'ект натхнення — селядзец і Суцін

У Смілавічах адкрылася незвычайная выстава

«Селядзец пад пэндзлем»... Менавіта так называецца незвычайная выстава-гульня, якая адкрылася на стары Новы год у Смілавіцкім музеі Хаіма Суціна. Вядома, які Новы ці стары Новы год без салаты «селядзец пад футрам», назву якой абыгралі ў назве выставы? Але дзень для дэманстрацыі «мастакоўскай салаты» быў выбраны найперш таму, што 13 студзеня 130 гадоў назад у Смілавічах у сям'і простага краўца нарадзіўся мастак, які заваюе сусветную славу, чые карціны стануць аднымі з самых дарагіх у свеце...

Выставу-амаж у гонар Хаіма Суціна ініцыіравала вядомы архітэктар і грамадскі дзеяч Галіна Левіна, якую падтрымала мастацтвазнаўца Надзея Усава. Для натхнення ўдзельнікам была прапанавана вядомая карціна Суціна «Нацюрморт з селядцом і памідорамі». Мастак маляваў яе падчас свайго паўгаладнага жыцця ў Парыжы, калі ён яшчэ быў непрызнаны, апантана ствараў, выплюхваючы пачуцці ў экспрэсіяністычных фарбах і формах... Селядцы на яго карціне ператвараюцца ў сімвал жаданага дабрабыту сярод неўладкаванага, хаатычнага жыцця. Але васямнаццаць беларускіх творцаў, якія адгукнуліся на ідэю выставы, інтэрпрэтавалі вобраз селядца кожны па-свойму — атрымаўся незвычайна шырокі спектр, на любы густ... Выказванні прафесіяналаў годна падтрымалі юныя навучэнцы Арт-цэнтра «Вулей», Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна, у будынку якога і знаходзіцца экспазіцыя «Прастора Хаіма Суціна».

Амаль усе ўдзельнікі выставы сабраліся на адкрыцці — яго вяла тэлевядучая Першага канала Беларускага тэлебачання Вольга Венская, адна з «рухавікоў» незвычайнага праекта. Гасцей віталі ажыўленыя героі карцін Суціна — нявеста і маленькі кандытар, іх увасаблялі навучэнцы Цэнтра творчасці. Дырэктар музея «Прастора Хаіма Суціна» Святлана Хасяневіч шчыра падзякавала ўсім удзельнікам і гасцям і запэўніла, што выставу за час экспанавання пабачаць шматлікія турысты, якія ахвотна наведваюць музей у Смілавічах. А для дзяцей Арт-цэнтра творы будуць прыкладамі жывапісу.

Галіна Левіна адзначыла, што тэма выставы абумоўлена яшчэ і тым, што ў мястэчку Смілавічы жыло шмат яўрэяў, квітнела яўрэйская культура, а селядзец — частка нацыянальнай кухні. Сама Галіна таксама намалявала карціну для выставы, якая называецца «Белы селядзец са скрылёчкамі лімона. Падарожжа». Гэта аптымістычная карціна, якая нагадвае пра далёкае мора і сонца над ім.

— Сённяшняя выстава — своеасаблівае паднашэнне Хаіму Суціну з нагоды яго юбілею, — лічыць Надзея Усава. — Мяне ўзрадавала, з якой ахвотай адгукаліся мастакі на дзіўную прапанову напісаць селядзец. І ўразіла, наколькі па-рознаму яны падышлі да гэтай тэмы.

На пытанне, што б сказаў Хаім Суцін аб гэтай выставе, Надзея Усава пажартавала: ён сказаў бы, што так, гэта цікавыя творы, але, у адрозненне ад яго, іх малявалі сытыя мастакі, у якіх няма прагнага жадання хутчэй з'есці сваю натуру. Ёсць любаванне селядцом, часам шкадоба да яго, нейкая гісторыя....

Сапраўды, творы выставы «Селядзец пад пэндзлем» можна разглядаць бясконца. Карціна старшыні Беларускага саюза мастакоў Глеба Отчыка называецца «Назіральнік»: у абрысах рыбы можна ўгледзець цэлы сусвет, а яе вока гіпнатычна ўзіраецца ў нас. Уладзімір Пракапцоў намаляваў нацюрморт у стылі тых часоў, калі ствараў Хаім Суцін: палатно з селядцамі на фоне старой газеты «Віцебскі лісток» так і называецца — «Віцебск 1918». Карціна Дзмітрыя Сурыновіча «Рыба-ежа» выканана ў пазнавальнай манеры майстра: тут рыба — не проста страва, а жывая істота, забойства якой варта аплакаць. Рыба вядомай мастачкі Марыі Ісаёнак атрымалася святочна-ўрачыстай, а «Селядзец на салаце» Ніны Кухарэнка выклікае нечаканыя асацыяцыі, бо лісты салаты — гэта і пяшчотна-зеленаватыя аблокі, а можа, крылы, а можа, пеністыя хвалі... Аканілі гледачы і карціну Веранікі Клімашэвіч «Шлях з глыбіні». На гэтым палатне з варожвальным спалучэннем колераў селядзец — не аб'ект і не ежа, а герой, дзейны персанаж. Касяк рыб назірае, як самая смелая з іх падымаецца з глыбіні да святла — бо заўсёды нехта паказвае шлях іншым, а ўсё жывое імкнецца да святла, дабра, спазнання свету. Залацістыя селядцы на карціне «Улоў» Марыі Кручковай нагадваюць пра лета, «Шлях» Сяргея Варкіна адсылае да хрысціянскай сімволікі, абедзве прадстаўленыя на выставе карціны Дар'і Карпавай «Каціны пачастунак» і « Салака ў пакеце» таксама метафарычныя. Арыгінальную карціну-шыльду выставы на дрэве намаляваў мастак-педагог Вадзім Дурко, які працуе ў цэнтры, «Ода селядцу» — галоўны сэнс нацюрморта ў галандскім стылі Надзеі Лівенцавай і дэкаратыўнай карціны Ніны Пілюзінай.

Былі і не толькі карціны... «Рыба» Ілы Арэшкі можа ўпрыгожыць любы інтэр'ер: гэта арт-аб'ект-свяцільнік, які выпраменьвае таемнае святло марской глыбіні. Гледачы спецыяльна падыходзілі паглядзець аблізу на работу народнага рэзчыка са слабым слыхам Леаніда Нарушэвіча, каб упэўніцца, што рыбы ў яго інсталяцыі выразаныя з дрэва, а не натуральныя. Як смачную ежу падала сваіх селядцоў і Зінаіда Скарабагатая, маці вядомай мастачкі, прафесійны кухар, якая пачала маляваць сем гадоў назад.

У адкрыцці выставы прынялі ўдзел начальнік упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Чэрвеньскага райвыканкама Ірына Змачынская і старшыня Смілавіцкага сельвыканкама Ірына Марціновіч.

— Вельмі важна, калі сустракаюцца ў адным праекце вядомыя таленты, прафесіяналы, аматары і зусім юныя, — адзначыла Ірына Змачынская. — Прывіць нашым дзецям любоў да жывапісу, да гульні колераў, каб яны творчасцю праслаўлялі свой край, — важная задача.

Але сузіранне карцін — гэта было яшчэ не ўсё дзейства. Вядомы беларускі дызайнер Наталля Мініна прэзентавала калекцыю вясельных сукенак з лёну, якой апладзіравалі на славутых подыумах свету. Сімвалічна, што паказ адбыўся ў зале, прысвечанай творчасці яшчэ аднаго ўраджэнца Смілавіч і мастака Парыжскай школы Шрагі Царфіна, які ў свой час рабіў узоры для тканін.

Выстава «Селядзец пад пэндзлем» — вельмі незвычайны праект, які абуджае цікавасць гледачоў і фантазію творцаў і ўпісаецца ў мясцовыя традыцыі. Сярод іншага, на адкрыцці выставы згадалі, як калісьці падчас зімовых святаў у гарадскі парк Смілавіч абавязкова выкочвалі для продажу бочкі з селядцамі... Можа, калі-небудзь смілавіцкі селядзец у стылізаванай упаковцы пад бочачку стане яшчэ адным брэндам горада? Ва ўсялякім выпадку, ідэя фестывалю селядца спадабалася многім.

Напрыканцы чатыры мастакі вырашылі падарыць свае творы цэнтру. Будзе цяпер там знаходзіцца і жывапісная копія карціны Суціна з селядцамі работы Віктара Варанкевіча, падарунак мінскай галерэі «Прадмесце».

Выставу, якая прадоўжыцца цягам трох месяцаў, можа паглядзець кожны ахвотны, хто наведае музей Хаіма Суціна ў Смілавічах.

Людміла ІВАНОВА.

Новыя кнігі

ПРАЗ ПРЫЗМУ ЭСТЭТЫКІ КЛАСІЧНАГА СЛОВА

Асоба Максіма Багдановіча, яго творчасць на працягу многіх дзесяцігоддзяў знаходзіцца ў цэнтры пільнай увагі даследчыкаў, бібліёграфаў, гісторыкаў і тэарэтыкаў літаратуры. А гэта сведчыць, што спадчына слыннага паэта настолькі зместава багатая, шматмерная, сімвалічная, што не можа ўкласціся ў пэўныя інтэрпрэтацыйныя мярэжы, быць расытанай і зразумелай даастатку, канчаткова.

«Загадка Багдановіча» яшчэ доўга будзе непакоіць і даследчыкаў-багдановічазнаўцаў, і прыхільнікаў творчасці паэта. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшла чарговая манаграфія Валерыя Максімовіча «Эстэтыка творчасці Максіма Багдановіча» — плён шматгадовай працы вядомага даследчыка літаратуры, крытыка, культуролага, загадчыка аддзела філасофіі літаратуры і эстэтыкі Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Як сведчыць анатацыя да кнігі, у ёй разгледжаны тэарэтыка-метадалагічныя, філасофска-эстэтычныя праблемы ў кантэксце творчасці Максіма Багдановіча. Аўтар слушна даводзіць, што культуратворчая дзейнасць Багдановіча выступае істотным складнікам развіцця нацыянальнай культуры.

Манаграфія складаецца з трох раздзелаў, кожны з якіх прысвечаны разгляду пэўнага праблемнага кола пытанняў. У першым раздзеле «Па шляху цывілізацыйнага дыялогу: феномен творчасці ў кантэксце станаўлення інтэлектуальнай культуры» закранаюцца пытанні некаторых асаблівасцяў механізму культуратваральных працэсаў у культурным ландшафце Беларусі пачатку XX ст., раскрываецца спецыфіка рэалізацыі інтэлектуальнага і духоўна-творчага патэнцыялу літаратуры, робіцца спроба знаходжання агульных пунктаў судакранання творчасці беларускага паэта і рускага рэлігійнага філосафа Паўла Фларэнскага.

У другім раздзеле «Універсалізм творчасці Максіма Багдановіча» слушна сцвярджаецца, што эстэтычныя пошукі Багдановіча былі наўздзіў разнастайнымі, полікультурнымі, шматмернымі. Яны вылучаюцца дыялагічнасцю, цэласнасцю, сістэмнасцю, праграмнасцю ўспрымання розных мастацкіх сістэм і практык. Не пазбаўленым падстаў выглядае і меркаванне даследчыка, што на прыкладзе творчасці Багдановіча можна рэканструяваць своеасаблівую мадэль станаўлення нацыянальнай культуры, прасачыць алгарытм змяненняў у сацыякультурнай сістэме каштоўнасцяў у працэсе культуратворчасці.

Паводле пераканання даследчыка, Максімам Багдановічам ставілася задача стварэння літаратурнага канона як першаабраза, эталона нацыянальнага стылю, у якім будуць замацаваны пэўныя духоўныя канстанты нацыянальнага жыцця, мастацкія ўзоры, закліканыя выяўляць глыбінныя асновы нацыянальнага светапогляду і светапасціжэння.

У трэцім раздзеле «Тэарэтыка-метадалагічныя і эстэтычныя аспекты творчасці Максіма Багдановіча» размова ідзе пра адметнасць Багдановіча як крытыка і даследчыка літаратуры, эвалюцыя якога адбывалася ў кірунку пераадолення пастулатаў культурна-гістарычнай школы і вяла да засваення метадалогіі эстэтычнага літаратуразнаўства. Даволі слушнымі і ў нечым інтрыгоўнымі падаюцца разважанні даследчыка наконт крытычнай прозы Багдановіча як спецыфічнай мадэлі мастацкага і псіхалагічнага аўтапартрэта.

Мастацкая спадчына Максіма Багдановіча адкрывае новыя перспектывы для больш шырокага задзейнічання яе вялізнага мастацка-эстэтычнага патэнцыялу ў развіцці інтэркультурных сувязяў, камунікацый, абменаў, якія забяспечваюць і падтрымліваюць шматмерную сэнсавую культурную прастору. Безумоўна, кніга выклікае вялікую цікавасць у спецыялістаў-багдановічазнаўцаў, а таксама нашмат узбагаціць веды школьнікаў і студэнтаў пра класіка беларускай літаратуры, паспрыяе новаму прачытанню яго мастацкай і літаратурна-крытычнай спадчыны.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

«Духоўнае адраджэнне» ў кніжнай выставе

«Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца»: менавіта так гучыць назва традыцыйнай кніжнай выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая прысвечана лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Гэтая выстава прадстаўляецца штогод. Тут і кнігі з фондаў бібліятэкі, і выразкі з газетных нумароў, і выяўленчыя дакументы, і разнастайныя сувеніры — адным словам, усё, тэматычна звязанае з дзейнасцю лаўрэатаў.

Зладзіць экспазіцыю такога кшталту не так проста, як можа здацца на першы погляд. Па словах **вядучага метадыста бібліятэкі Надзеі КІРЧАНКІ**, тут патрэбна аператыўнасць, да таго ж яшчэ і карпатлівая праца па пошуку інфармацыі.

— Мы стараемся патрапіць на саму цырымонію. Там наш куратар гутарыць з лаўрэатамі. Яны дзеляцца нейкімі невялікімі сувенірамі: паштовачкамі, буклетамі, значкамі. Усё гэта потым уваходзіць у экспазіцыю, — расказвае Надзея Кірчанка.

Сёлета прэміі ўручаліся за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, у грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, за ўклад у захаванне культурнай спадчыны, а таксама за дасягненні ў тэатральным, музычным, дэкаратыўна-прыкладным і народным мастацтве. Усё гэта гарманічна адлюстравалася ў кніжнай экспазіцыі.

Напрыклад, стэнд, які прысвечаны калектыву дзяржаўнай установы «РНПЦ «Маці і дзіця», прадстаўляе не толькі кнігі і публіцыстычныя матэрыялы, але і невялікую ёлачную цацку: анёлак на драўляным кані. А міні-экспазіцыя, якая паведамляе пра дзейнасць Полацкага кадэцкага вучылішча, радуе гледачоў гістарычнай літаратурай дарэвалюцыйных часоў і сучаснымі фотаздымкамі. Яны яшчэ і размешчаны зусім побач, быццам бы ствараючы стужку паміж часамі.

Наведаць гэтую выставу можна да 17 сакавіка. Яна размешчана ў кальцавой галерэі на другім паверсе.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

ПІРАТЫ ЧЫРВОНАГА МОРА

Чаму разгарэўся маштабны канфлікт на Блізкім Усходзе?

ЗША працягваюць наносіць ракетныя ўдары па Емену. Абстаноўка ў Чырвоным моры абвастраецца. Раней эксперты запэўнівалі, што сітуацыя не выйдзе за палітычную плоскасць, аднак на мінулым тыдні пачалі разгортвацца вайсковыя дзеянні. У ноч на 12 студзеня ЗША і Вялікабрытанія пры падтрымцы Аўстраліі, Бахрэйна, Канады і Нідэрландаў нанеслі ўдары па ваенных аб'ектах мяцежнага руху «Ансар Ала» (хусіты) у Емене. Абстрэлы вяліся з выкарыстаннем ракет «Тамагаўк» з баявых караблёў, падлодак, а таксама знішчальнікаў. Пасля тэлеканал Al Masirah паведаміў, што ЗША і Вялікабрытанія атакавалі еменскія правінцыі Дамар, Саада, Таіз, Хадзэйда, Эль-Байда. Па звестках тэлеканала Al Hadath, як мінімум тры ўдары былі нанесены па аб'ектах хусітаў у лагеры Аль-Карн. Прадстаўнікі руху пагражаюць у адказ «падпаліць увесь рэгіён». І яны на гэта здольныя. Чаму разгарэўся яшчэ адзін маштабны канфлікт на Блізкім Усходзе, чым гэта пагражае?

«ПАРТЫЗАНЫ АЛАХА»

Для таго каб дакладна акрэсліць цяперашнюю сітуацыю, варта разабрацца з перадумовамі. Гісторыя хусіцкага руху пачалася яшчэ ў 1990-я гады. Яго асноўная база — населеная зэйдытамі (галіна шыізму, які распаўсюджаны на поўначы краіны, — большасць насельніцтва Емена вызнае сунізм шафііцкага кшталту) правінцыя Саада на мяжы з Саудаўскай Аравіяй. Заснавальнік руху, самаабвешчаны імам Хусейн Бадрудзін аль-Хусі, выступаў за вяртанне да вытокаў, да таго часу, калі іслам яшчэ не падзяляўся на розныя вучэнні і школы, і аб'яднанне ўсіх мусульман на аснове Карана, у якім ён чэрпаў не толькі рэлігійна-маральныя, але і сацыяльна-эканамічныя ўстаноўкі. Свой рух ён называў «Ансар Ала», гэта значыць «Партызаны Алаха». «Хусіты вызнаюць асобную, самастойную галіну ісламу, якая зараз існуе толькі ў Емене. Гэта, безумоўна, шыіцкі ісламскі, аднак ён не настолькі блізкі да астатняга шыізму, як гэта часта лічыцца. Ён вельмі самастойны і вельмі адрозніваецца ад шыізму, напрыклад у Іране», — растлумачыў lenta.ru палітолаг, эксперт Расійскага савета па міжнародных справах (РСМС) Кірыл Сямёнаў.

У сваёй знешнепалітычнай ідэалогіі хусіты выступаюць з радыкальных антысаходніх пазіцый, выкарыстоўваючы лозунг: «Смерць ЗША, смерць Ізраілю, праклён яўрэям, перамога ісламу». Пры гэтым іх афіцыйныя прадстаўнікі падкрэсліваюць, што рух не выступае за літаральнае знішчэнне ЗША і Ізраіля, а толькі за зрушэнне іх урадаў, якія праводзяць «імперыялістычную» палітыку ў адносінах да ісламскага свету. Хусіты лічаць свой рух часткай узначаленай Іранам «восі супраціву» Ізраілю, ЗША і ўсяму Захаду — разам з ХАМАС і «Хезбалой».

Аднак палітолаг Кірыл Сямёнаў перасцярог ад таго, каб лічыць хусітаў проксі-сілай, якая дзейнічае ў інтарэсах Ірана. «Зэйдыты ўсё ж вельмі моцна адрозніваюцца ад іранскіх шыітаў. Вядома, у іх ёсць пункты судотыку, агульныя ідэалагічныя ўстаноўкі (асабліва датычна Ізраіля і ЗША)», — кажа ён. Эксперт падкрэсліў, што хусіцкі рух не быў створаны эмісарамі Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі (КВІР). «Ён з'явіўся ў Емене абсалютна самастойна, а ў асобе Ірана знайшлі саюзніка, таму што абаперціся было больш папросту няма на каго», — лічыць Кірыл Сямёнаў.

ГУМАНІТАРНАЯ КАТАСТРОФА

У 2004 годзе хусіты фактычна ўзнялі паўстанне супраць урада Емена. Прэзідэнта краіны Алі Абдалу Салеха яны абвінавацілі ў карумпаванасці і сувязях з ЗША. Вайна працягнулася шэсць гадоў і ператварыла паўночныя правінцыі Емена з шыіцкім насельніцтвам у зону гуманітарнай катастрофы. Ураду так і не ўдалося перамагчы хусітаў, баявыя дзеянні скончыліся, калі было падпісана пагадненне аб спыненні агню.

Праўда, ужо ў наступным годзе Емен захапілі падзеі «арабскай вясны». Хусіты скарысталіся хваляваннямі, каб пашырыць свой уплыў і аднавіць узброеную барацьбу супраць урадавых войскаў і груповак, якія канкуруюць. Да 2014 года ў краіне разгарнулася поўнамаштабная грамадзянская вайна. Да 2015-га хусіты і групоўкі, якія іх падтрымліваюць, здзейснілі ў Емене ваенны пераварот. Фактычным урадам краіны стаў Рэвалюцыйны камітэт пад кіраваннем Мухамеда Алі аль-Хусі, брата заснавальніка руху Хусейна Бадрудзіна аль-Хусі, які яшчэ ў 2004 годзе загінуў у сутыкненні з урадавымі войскамі.

На прыход да ўлады хусітаў вельмі востра адрэагавалі ў Саудаўскай Аравіі. Манархіі не патрэбен быў ачаг нестабільнасці каля сваіх межаў, ды і ідэалагічна яна з хусітамі разыходзілася даволі сур'ёзна: тыя не прымалі вахабіцкі іслам і лічылі здраднікамі ўсе мусульманскія ўрады, якія пайшлі на саюз з ЗША. 25 сакавіка 2015 года Ваенна-паветраныя сілы Саудаўскай Аравіі пачалі ваенную аперацыю «Бура рашучасці», мэтай якой быў разгром сіл хусітаў. Падтрымку саудаўцам аказалі іншыя манархіі рэгіёна, арыентаваныя на ЗША: Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і Бахрэйн. Авіяцыя практычна поўнасцю знішчыла СПА Емена і закрыла паветраную прастору над краінай, а следам пачалася поўнамаштабная аперацыя з прымяненнем артылерыі і флоту. 25 красавіка «Бура рашучасці» перайшла ў новую аперацыю пад назвай «Адраджэнне надзеі». Яе мэтай аб'явілі «кропкавую» барацьбу з хусіцкім рухам. Авіяўдары па ваенных базах і пазіцыях хусітаў працягнуліся, а на гарады і правінцыі скідваліся ўлёткі, якія заклікалі мясцовых жыхароў далучацца да барацьбы з мяцежнікамі.

Інтэрвенцыя ўзбадзёрыла антыхусіцкую апазіцыю ў самім Емене. Былы прэзідэнт краіны Абд-Рабу Мансур Хадзі, зрынуты хусітамі, вярнуўся ў краіну і аб'явіў аб пачатку ўзброенай барацьбы супраць іх. Краіна зноў пагрузілася ў хаос грамадзянскай вайны, працягваліся і бамбардзіроўкі арабскай каліцыяй. У Емене зноў пачалася гуманітарная катастрофа, якая на гэты раз закранула ўсю краіну. У канфлікт умяшалася ААН, якая прапанавала дарожную карту па выхадзе з крызісу. Яна прадугледжвала адмену хусіцкай канстытуцыі і стварэнне пераходнага ўрада, аднак з-за нераадольных рознагалоссяў паміж бакамі канфлікту яе рэалізацыю так і не пачалі.

З часам інтэнсіўнасць баявых дзеянняў у Емене знізілася, але поўнасцю баявыя дзеянні не спыніліся. Сілы кааліцыі бамбардзіравалі пазіцыі хусітаў, тыя адказвалі тэрактамі супраць прыхільнікаў старога ўрада. Гэту вайну нават назвалі «найгоршай гуманітарнай катастрофай сучаснасці». Пры гэтым палітычныя пазіцыі хусітаў толькі ўмацаваліся. Яны паказалі магчымасць навязаць сур'ёзны супраціў буйной міжнароднай кааліцыі з сучасным узбраеннем, якая карыстаецца падтрымкай ЗША.

Па словах эксперта Кірыла Сямёнава, сілам арабскай кааліцыі так і не ўдалося зламаць паўстанцаў, таму што хусіты карысталіся вялізнай падтрымкай у паўночных раёнах Емена, населеных у асноўным зэйдытамі. «Акрамя таго, іх сілы былі дастаткова баяздольныя і атрымлівалі рэгулярную падтрымку ад Ірана. Яны мелі сур'ёзную падрыхтоўку і накіраванасць на вынік. Плюс на іх бок перайшлі найбольш баяздольныя часткі еменскай арміі», — адзначыў Кірыл Сямёнаў.

У АДКАЗ НА АГРЭСІЮ

У пачатку 2021 года новы прэзідэнт ЗША Джо Байдэн аб'явіў аб спыненні падтрымкі наступальных аперацый сіл арабскай кааліцыі ў Емене і аб пачатку пошуку мірных шляхоў урэгулявання канфлікту. ЗША нават выключылі хусітаў са спісу тэрарыстычных арганізацый, што адкрыла іх ураду доступ да гуманітарнай дапамогі. Тыя горача віталі такі крок і знізілі напал сваёй рыторыкі. Здавалася, у шматпакутнага Емена з'явіўся шанц на мір.

У 2022 годзе супрацьлеглыя бакі пры садзейнічанні ААН дамовіліся аб часовым перамір'і, якое працягвалася кожныя два месяцы. За гэты час удалося правесці абмен палоннымі, запусціць праграмы дапамогі дзецям, паставіць у краіну неабходныя гуманітарныя тавары. На працягу 2023 года міжнародныя назіральнікі былі ўпэўненыя, што грамадзянская вайна ў Емене вось-вось завершыцца.

Усё змяніў канфлікт паміж Ізраілем і ХАМАС. Хусіты, безумоўна, выступілі ў падтрымку сектара Газа. Пасля пачатку ізраільскіх удараў «Ансар Ала» вывеў людзей на масавыя дэманстрацыі. Пратэстоўцы трымалі ў руках палесцінскія сцягі і выкрыквалі лозунгі ў падтрымку жыхароў Газы. Арганізацыя на афіцыйным узроўні заявіла аб гатоўнасці адправіць байцоў у Газу, абвінаваціла ЗША ў спансіраванні «сіянісцкага ўтварэння», а неўзабаве пачала наносіць ракетныя ўдары па тэрыторыі Ізраіля.

14 лістапада групоўка аб'явіла, што будзе атакаваць усе судны, звязаныя з Ізраілем, і не дазволіць ім праходзіць праз воды Чырвонага мора і Баб-эль-Мандэбскага праліва. Свае дзеянні хусіты назвалі адказам на «амерыкана-ізраільскую агрэсію ў сектары Газа». У пачатку снежня групоўка прыгразіла нападаць наогул на ўсе судны, якія накіроўваюцца ў Ізраіль праз акваторыю Чырвонага мора і яго вузкую частку — Баб-эль-Мандэбскі праліў, незалежна ад таго, хто імі валодае.

З тых часоў некалькі камерцыйных і ваенных караблёў у Чырвоным моры падвергліся нападам. Адным з самых рэзанансных выпадкаў стаў захоп 19 лістапада грузавога судна Galaxy Leader з міжнародным экіпажам. Хусіты адбуксіравалі яго да ўзбярэжжа Емена і заявілі, што не будуць абмяркоўваць умовы вызвалення членаў экіпажа, пакуль Ізраіль не спыніць баявыя дзеянні ў сектары Газа.

З-за гэтага чатыры найбуйнейшыя сусветныя суднаходныя кампаніі прыпынілі праход судоў праз Суэцкі канал або накіравалі іх іншымі маршрутамі.

Заявы аб гэтым выпусцілі швейцарская суднаходная кампанія Mediterranean Shipping Company (MSC), французская CMA CGM, дацкі суднаходны гігант Maersk і нямецкая транспартная кампанія Hapag-Lloyd. У сукупнасці на іх прыпадае амаль 54 працэнты кантэйнерных перавозак па ўсім свеце.

У адказ ЗША заявілі аб стварэнні «максімальна шырокай» марской кааліцыі для абароны суднаходства ў Чырвоным моры. У рэгіён былі накіраваны караблі ВМС ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. 10 студзеня хусіты атакавалі ракетамі і дронамі ваенныя караблі ЗША і Вялікабрытаніі, якія канваіравалі грамадзянскія судны. Ваенным прыйшлося задзейнічаць авіяцыю. У адказ на гэта Савет Бяспекі ААН ухваліў рэзалюцыю, якая патрабуе ад хусітаў спынення нападаў на гандлёвыя караблі.

«Безумоўна, Злучаныя Штаты разам з англічанамі парушылі, проста растапталі ўсе мажлівыя нормы міжнароднага права, уключаючы рэзалюцыю Савета бяспекі, якая толькі заклікала абараняць камерцыйнае суднаходства. Бамбіць Емен ніхто не ўпаўнаважваў», — адзначыў міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў. «Бязмежжа», якое здзяйсняецца ў дачыненні да Емена, міністр параўнаў з дзеяннямі заходніх краін супраць Лівіі, якую «разбамбілі, ператварылі ў «чорную дзірку». «Апраўдальныя заявы, якія гучаць з Вашынгтона, выглядаюць неяк вельмі нікчэмна, я б сказаў», — заўважыў Сяргей Лаўроў.

Дэмакратычная партыя ЗША і ізраільскае лобі зацікаўлены ў пашырэнні ўдзелу амерыканскага войска ў канфлікце на Блізкім Усходзе, лічыць усходазнаўца Руслан Сафараў. «Без пераможнай вайны Байдэн не перавыбераца, — лічыць эксперт tsargrad.tv. — Ён пацярпеў занадта шмат цяжкіх паражэнняў, пачынаючы з Афганістана і заканчваючы Украінай. ЗША панеслі занадта цяжкія страты. Каб нівеліраваць гэта ўражанне, патрэбны перамогі».

АХІЛЕСАВА ПЯТА

Еменскі рух «Ансар Ала» працягне наносіць удары па ваенных і гандлёвых караблях ЗША, нягледзячы на яго ўключэнне ў тэрарыстычны спіс, заявіў РІА «Новости» член палітбюро арганізацыі, якая кіруе на поўначы Емена, Хузам аль-Асад. «Мы лічым наша ўключэнне з боку ЗША ў пералік тэрарыстычных арганізацый палітычным шантажом з тым, каб мы адступілі ад сваіх пазіцый, якія датычацца падтрымкі прыгнечаных у сектары Газа, якія падвяргаюцца генацыду з боку войска ізраільскіх акупантаў пры падтрымцы ЗША і Захаду», — сказаў аль-Асад.

Паводле яго слоў, меры, прынятыя ЗША, не спыняць «Ансар Ала», які «працягне падтрымліваць братоў у Газе ўсімі магчымымі спосабамі». «Ваенна-марскія сілы Емена прадоўжаць забараняць ізраільскім суднам, а таксама іншым звязаным з Ізраілем караблям праход у Чырвонае і Аравійскае моры. Што датычыцца амерыканскіх суднаў, ваенных або камерцыйных, а таксама іншых караблёў, якія дзейнічаюць у інтарэсах ЗША, то па іх таксама будуць наносіцца ўдары з боку нашых сіл», — заявіў аль-Асад.

Ён адзначыў, што ЗША, якія нанеслі ўдары па тэрыторыі Емена, «здзейснілі вялікае злачынства, парушыўшы суверэнітэт краіны». Таксама ён заўважыў, што Вашынгтон «знаходзіцца не ў той пазіцыі, каб уключаць якую-небудзь краіну ў тэрарыстычны спіс». «У асаблівасці, на фоне садзейнічання Амерыкі здзяйсненню жудаснай разні нашых братоў у Газе або здзяйснення злачынстваў у іншых частках свету, вядзенню вайны або яе правакацыі ў Афганістане, Лівіі, В'етнаме і ў многіх краінах», — дадаў хусіцкі палітык.

Пры гэтым эксперты ўпэўнены, што цалкам нейтралізаваць хусітаў не ўдасца. «Мы памятаем, як гэта спрабавала зрабіць Саудаўская Аравія і што з гэтага выйшла», — упэўнены палітолаг, эксперт РСМС Аляксей Навумаў. З ім салідарны і палітолаг Кірыл Сямёнаў: «Мы не ведаем, наколькі адчувальныя гэтыя ўдары для хусітаў. Іх сем гадоў бамбіла саудаўская кааліцыя».

Хусіты здольныя на скрышальны адказ. «У іх шматгадовы досвед грамадзянскай вайны і супрацьстаяння міжнароднай кааліцыі, — адзначыў РІА «Новости» дырэктар Цэнтра вывучэння краін Блізкага Усходу і Цэнтральнай Азіі Сямён Багдасараў. — Сістэма бункераў і тунэляў развіта, хусіты гатовыя да доўгатэрміновай вайны». «Гэта моцныя, цярплівыя байцы. Хусіты — майстры сучаснай партызанскай вайны, якія выкарыстоўваюць слабыя бакі мацнейшых дзяржаў, — адзначае The Washington Post. — І яны размешчаны на вяршыні аднаго з самых стратэгічна важных водных шляхоў у свеце». Еменскія хусіты намацалі ахілесаву пяту Захаду, што падрывае глабальны ланцужок паставак і асабліва моцна ўдарае па ЗША. Як падкрэсліла The Washington Post, «гэта здольнасць хусітаў выкарыстоўваць вузкія месцы становіцца ўсё важнейшай уразлівасцю глабальнай эканомікі, якую Злучаныя Штаты, падобна, бяссільныя выправіць».

Захар БУРАК.

«Нам бы заслужыць міласці Божай»

ПАД НАГЛЯДАМ ЦАРЫЦЫ НЯБЕСНАЙ

Мне пашчасціла прыехаць у Талачын у марозны сонечны дзень і ўбачыць талачынскую жамчужыну ва ўсёй красе. Ёй нельга не захапіцца. Беласнежныя вежы велічнай Свята-Пакроўскай царквы з бліскучымі залатымі купаламі на фоне блакітнага неба зачароўваюць. Магчыма, з тымі ж пачуццямі ёй любаваўся ў пачатку XVII стагоддзя канцлер ВКЛ Леў Сапега, па загаду якога яна і была пабудаваная ў модным тады стылі віленскага барока. Гэты храм лічыўся адным з найпрыгажэйшых у Вялікім Княстве Літоўскім. Цяпер ён адзін з найпрыгажэйшых у Беларусі.

Але яшчэ 13 гадоў таму ў гэта мала верылася. Калі матушка Анфіса прыйшла сюды ў 2011 годзе, храм меў такі непрыглядны выгляд, што першае пачуццё, якое яна перажыла, было жаданне хутчэй адсюль збегчы. І напэўна, калі б не благаславенне яе духоўнікаў і мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, які на той час быў Патрыяршым Экзархам Усяе Беларусі, так і зрабіла б. Успамінае, што на вежах храма раслі

Матушка Анфіса.

рычная каштоўнасць, трэба было прытрымлівацца патрабаванняў, якія існуюць пры рэстаўрацыі. Калі ў ім не было першапачаткова роспісу, мы яго і не рабілі.

Падчас рэстаўрацыі ў алтары пад прастолам была знойдзена цудадзейная крыніца. Звярнулі ўвагу на тое, што ножкі прастола прагнілі, а калі паднялі яго, убачылі гэты цуд. Будаўнікі зрабілі так, каб гаючая вада паступала адначасова ў каплічку ў гонар Архангела Міхаіла і каплічку-купальню ў гонар Свяціцеля Мікалая. Наогул, на тэрыторыі манастыра знойдзены ўсе тры крыніцы,

Фантан-крыж.

дрэўцы, а тэмпература ўнутры яго вышэй за 2 градусы зімой не падымалася. Двухпавярховы будынак XVIII стагоддзя па суседстве з храмам, дзе жылі сёстры, таксама быў не ў лепшым стане. Ён амаль не ацяпляўся, і зімой тэмпература ў келлях складала ў сярэднім 7-8 градусаў. Сёстры спалі ў верхнім адзенні, накрыўшыся паверх коўдры ўсім, што было.

— Калі даведалася, што храм з гісторыяй, пачала шукаць інфармацыю пра яго ў Пецярбургскіх, Маскоўскіх, Мінскіх, Віцебскіх, Аршанскіх, Магілёўскіх архівах, — расказвае матушка. — І знайшла вельмі ўнікальныя матэрыялы. Неверагодна было і тое, што калі мы звярнуліся ў праектны інстытут, там ужо быў праект на аднаўленне нашага храма. Яго толькі трэба было крыху падкарэкціраваць. Усё гэта дапамагло ўвайсці ў 2013 годзе ў рэспубліканскую і абласную інвестыцыйныя праграмы па рэканструкцыі гістарычных будынкаў з рэстаўрацыяй. Да справы далучыліся ўсе — і дзяржава, і прыхаджане, і мецэнаты. Пакроўскі храм аднаўляўся пад кіраўніцтвам Міністэрства культуры. Паколькі ён гістаб якіх ішла гаворка ў гістарычных дакументах.

Сёння ў храме цёпла і ўтульна не толькі ад мноства абразоў і багатага царкоўнага ўбранства. Вялікія плошчы абагравае кацельная на прыродным газе, якая працуе на тэрыторыі манастыра.

МАНАСТЫРСКІ ГАРАДОК

Знаходзіцца на тэрыторыі манастыра, у тым ліку зімой, прыемна. Ва ўсім адчуваецца клапатлівая гаспадарчая рука. Актыўная матушка паклапацілася пашырыць манастырскія землі ўдвая. А пабудоў і рознага роду ўбранства стала ў разы болей.

— У праграме было закладзена толькі аднаўленне храма і сястрынскага корпуса, — расказвае яна. — Але мы пайшлі далей. З дапамогай Божай пабудавалі цэлы комплекс. Было два будынкі і чатыры ржавыя купалы, а стала 14 залатых купалаў і 14 будынкаў.

Дзякуй уладам, прыхаджанам, спонсарам — усім, хто нам дапамагаў і дапамагае. У мяне кіраўніцтва ўжо пытаецца: «Матушка, што будзем зараз будаваць?» Я ўсміхаюся — няма дзе. Калі ўспамінаеш, як тут было раней, разумееш, што аднымі чалавечымі сіламі такую работу выканаць немагчыма. Гэта благаславенне Маці Божай.

Гонар манастыра — шыкоўны шматфункцыянальны цэнтр, дзе, акрамя бібліятэкі, трапезнай, канферэнц-залы і іншых памяшканняў, знаходзіцца дамавы храм у гонар Усіх Святых — у ім кругла-

Талачынскія школьнікі зрабілі макет мясцовай святыні.

сутачна чытаецца «Псалтыр». Трапезную афармілі студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў, а храм распісалі прафесійныя мастакі. Унутраныя інтэр'еры зроблены пад даўніну, каб не рэзаніравалі на фоне храма XVII стагоддзя. Разам з тым гэта цалкам сучасны будынак з новай мэбляй, відэа-, аўдыятэхнікай, інжынернымі камунікацыямі.

У духоўна-асветніцкім цэнтры размешчаны класы нядзельнай школы для дзяцей і інвалідаў. Будынак, дарэчы, калісьці таксама быў храмавым, але яго выключылі з Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У ім знаходзіцца структурнае падраздзяленне МУС. Па хадайніцтве матушкі перад ведамствам яго перадалі манастыру.

На тэрыторыі манастыра ёсць капліца ў гонар Архангела Міхаіла, часоўня-храм у афонскім стылі ў гонар вялікамучаніка Харлампія Магнезійскага, купальні, гаспадарчыя пабудовы, кніжная лаўка, пякарня, кавярня для паломнікаў, дзіцячая гульнявая пляцоўка, нават фантан. Летам можна назіраць, як вада струменіцца па паверхні ляжачага на ўзвышшы крыжа і спадае каскадам у чашу. Летам сёстры займаюцца агародамі, вырошчваннем руж і іншых кветак.

ПРЫТУЛАК ДЛЯ ПАКУТУЮЧЫХ

Адна з галоўных функцый манастыра — дабрачыннасць. У памяшканнях шматфункцыянальнага цэнтра кожны раз збіраюцца то дзеці, то дарослыя, то інваліды. Для таго каб стварыць для іх свята, тут ёсць усе ўмовы. Манастыр акармляе яшчэ людзей паважанага ўзросту. А атрымаць талерку бясплатнага супу тут можа любы, хто мае ў гэтым патрэбу.

— Сёлета нашаму храму спаўняецца 420 гадоў, — расказвае матушка. — За ўвесь час свайго існавання ён ні разу не мяняў сваёй назвы і закрываўся толькі на некалькі месяцаў перад вайной. Але немцы яго адразу ж адкрылі. Справа ў тым, што яны паважалі Напалеона, а ён у нашым храме прыпыняўся. У ноч з 22 на 23 лістапада 1812 года ў сястрынскім корпусе манастыра Напалеон Банапарт правёў пасяджэнне штаба. У Талачыне ён атрымаў паведамленне, што рускія захапілі ўмацаванні на Бярэзіне і перакрылі дарогу на Мінск. Тут ён загадаў спаліць ваенныя архівы і эмблемы карпусоў арміі, упершыню прызнаўшы сваё паражэнне. Напалеон спаліў горад, але зрабіў нам вялікую паслугу — захаваў храм. Немцы, дарэчы, зрабілі пры адступленні з Талачына тое ж самае — зруйнавалі горад, але не кранулі храм.

НА МАНАСКІ ПОСТРЫГ У БЕЛАРУСІ БЛАГАСЛАВІЎ СТАРАЦ

Матушка Анфіса прызнаецца, што ў храме яна з дзяцінства.

— Нават калі была піянеркай, умудралася быць у царкве, — усміхаецца яна. — На царкоўныя святы нам у школе выдавалі чырвоныя павязкі і патрабавалі запісваць прозвішчы

Капліца-купальня ў гонар Свяціцеля Мікалая.

вучняў, якія прыходзілі на службу. Я спецыяльна брала гэтую павязку, каб пабыць на службе. Нікога, само сабой зразумела, не запісвала. У храме здымала павязку і душой пераносілася на неба. Я была актывістка, але веруючая. У Бога верылі і маці, і айчым, а дзядуля з бабуляй у свой час неслі паслушэнства — пелі на клірасе.

Пасля заканчэння інстытута і адпрацоўкі маладая інжынер адправілася на поўнач за раманты-

У класе нядзельнай школы.

кай. Жыла ў Ханты-Мансійскай акрузе пасярод тайгі 18 гадоў. За гэты час асэнсавана прыйшла да Бога, стварыла абшчыну і пабудавала на поўначы ажно сем храмаў.

— Маім першым духоўнікам быў старац Мікалай Гур'янаў, ён благаславіў мяне на манаскі пострыг, але ў Беларусі, — расказвае яна. — Гэта быў святы чалавек. Аднойчы бачыла, як ён ішоў на службу. Здавалася, старац парыў над зямлёй. У ім было вельмі шмат любові і дабрыні. Гасподзь даў яму дар прадбачання, але ён ніколі не асуджаў нават самага дрэннага чалавека. Наадварот, суцяшаў яго сваёй любоўю і падказваў правільны шлях. У 90-я гады, калі цікавасць да праваслаўя пачынала расці, ён шмат для каго стаў духоўным арыенцірам. Калі бацюшка сказаў мне, што я павінна прыняць манастыр у Беларусі, маўляў, гэта воля Божая, я нават спужалася. Мне тады гэта здавалася неверагодным і нездзяйсняльным. Калі старац адышоў да Госпада, маім духоўнікам стаў схіархімандрыт Уласій, які таксама накіроўваў мяне ў Беларусь. І тады я па яго благаславенні звярнулася да Экзарха Філарэта. У гэты манастыр мяне накіравалі часова, бо сышла матушка. Але, калі адкрылася дзяржпраграма, трэба было заставацца. Потым і духоўнік благаславіў мяне на служэнне тут.

НА МЕДАЛЯХ МАІХ — СВЯТЫЯ

Матушка радуецца, што ў яе атрымалася паслужыць Богу, але крыху саромеецца павышанай да сябе ўвагі.

— Усе ўзнагароды, якімі мяне адзначылі, вядома, важныя, — прызнаецца яна. — Я доўга саромелася іх насіць. Пакуль не падзялілася сваімі перажываннямі з духоўнікам. Ён за гэта на мяне крыху насварыўся, сказаў, што іх трэба насіць, бо на іх абразы святых. У мяне быццам бы вочы адкрыліся. Сапраўды, на медалях маіх — святыя. Таму зараз, калі трэба і калі гэта да месца, магу і надзець. Але гэта ўсё зямное. Мы гэта ўсё тут пакінем. Нам бы заслужыць міласці Божай, каб ён нас там, на небе, узнагародзіў.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара
і з сайта monasterium.by.
г. Талачын, Віцебская вобласць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Зеркало, инв. № 413; зеркало, инв. № 413	3,96	0,40	0,20
2	Комплекты мебели (бухгалтерия) 1. Шкаф для документов со стеклом, 2 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 2. Шкаф для документов закрытого типа, 6 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 3. Шкаф с полками для одежды, 2 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 4. Тумба офисная, 3 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 5. Стол письменный, 4 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 6. Тумба под стол, 3 шт.; комплекты мебели (бухгалтерия) 7. Стол овальный; комплекты мебели (бухгалтерия) 8. Комод; комплекты мебели (бухгалтерия) 9. Приставной стол (инв. № 1860)	244,44	24,44	12,22
3	Аппарат факсимильный Panasonik KX-FC966, инв. № 1720; ИБП Powerex VI650LED, инв. № 9719; факс Panasonic; телефонный аппарат Panasonic KT-TS, инв. № 247; радиотелефон Panasonic KT-TG, инв. № 312; телефон сотовый GSM Nokia X 16Gb, инв. № 853; телефон сотовый ZTE F327S черный, с/н 864581034946230, инв. № 13205; телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с/н 864754042565363, инв. № 12966; телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с/н 864754043711222, инв. № 12967	74,16	7,42	3,71
4	Шкаф со стеклом, инв. № 1855/1, угловая полка (набор мебели каб. юриста), инв. № 1859; шкаф гардеробный, инв. № 1855/3; стол с вырезом и тумбой, инв. № 1855/4	48,42	4,84	2,42
5	Огнетушители, инв. № 317, 318, 3 шт.; огнетушитель ОП-4, инв. № 237, 3 шт.	23,76	2,38	1,19
6	Блескомер WGG60-S, инв. № 451	360,00	36,00	18,00
